

АДМОЎНЫ ДНК-ТЭСТ НА БАЦЬКОЎСТВА

Сямейная газета

ТАЯМНІЦЫ ЗАСНАВАЛЬНІКА БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРА **15**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 САКАВІКА 2022 г. ЧАЦВЕР № 52 (29674)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла КАНАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:**

*«Мы працуем у акругах, і работа са зваротамі грамадзян для нас прыярытэтная. У першым чытанні прыняты законапраект аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. Нядаўна было праведзена пашыранае пасяджэнне камісіі, дзе былі зроблены акцэнты на тое, каб стварыць адзіную базу па зваротах. І каб звароты разглядаліся ў рамках кампетэнцый, што вельмі важна. Калі гэта кампетэнцыя мясцовых органаў улады, значыць, павінны рэалізаваць дадзены зварот мясцовыя органы ўлады. Прамыя тэлефонныя лініі і асабістыя прыёмы грамадзян — усё гэта захаваецца. І мы ў такім напрамку будзем працаваць».*

# Трывалая работа



Шчэбневы завод, размешчаны на радовішчы граніту «Сялянская ніва», знаходзіцца на адлегласці менш за кіламетр ад граніцы з Украінай у аграгарадку Глушкавічы Лельчыцкага раёна. А кар'ер здабычы граніту — за 300 метраў ад граніцы. Але рабочыя прадпрыемствы спакойна выконваюць сваю работу — побач пагранзастава «Глушкавічы», на ваенаслужачых якой цяпер ускладзена асаблівая адказнасць.

А на прадпрыемстве ідзе звычайная работа. Нядаўна пры падтрымцы дзяржавы быў рэалізаваны інвестпраект па мадэрнізацыі завода. Было створана 50 новых рабочых месцаў, пашырана лінейка вытворчасці. Шчэбень і граніт патрэбныя многім — толькі летась у Расію адправілі прадукцыі на 636,4 тысячы рублёў. Пастаўкі павялічыліся ў 2,6 раза.

А перавозяць важкую прадукцыю нашы волаты — БелАЗы. Мянавіта іх кіроўцы Васіль КАВАЛЕВІЧ, Іван ЛОЗКА і Уладзімір ЗЯНКОВІЧ і трапілі ў кадр фатографа.

**Фота Віктара ДРАЧОВА.**

## КОРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка правёў тэлефонную размову з кіраўніцтвам Туркменістана. Лідары краін абмеркавалі стан і перспектывы развіцця двухбаковых адносін.

• **Таргі юанямі пачнуць праводзіць на Беларускай валютна-фондавай біржы.**

• Міжнародная шахматная федэрацыя дазволіла беларусам выступаць пад сцягам FIDE.

• **У Беларусі 26 сакавіка пройдзе экалагічная акцыя «Гадзіна Зямлі».**

• Бясплатны перасоўны «Пульмаэкспрэс» усталююць 24 сакавіка каля Камароўскага рынку. Прайсці рэнтгенафлюараграфічнае абследаванне ўсе ахвотныя змогуць з 9.00 да 16.00.

Год гістарычнай памяці

## «ПАСХАЛКУ» МАЦІ-ГІСТОРЫІ АДГАДАЛІ МАЗЫРСКІЯ ПАДЛЕТКІ



**Як пажаўцелы кавалак кардону можа распаліць цікавасць дзяцей да даўно забытых старонак гісторыі роднага горада? Настаўнік і яе вучні з Мазыра правялі цэлае краязнаўчае даследаванне. Так старая савецкая паштоўка натхніла ўзяцца за гісторыка-патрыятычны праект: зняць міні-фільм і паспрабаваць сябе ў ролі скульптараў.**

СТАР. 3

На парадку дня

## КАБ ІЗНОЎ ШУМЕЛІ КРОНЫ

### У Гродзенскай вобласці на месцы буралому з'явяцца новыя лясныя плантацыі



**Для навядзення парадку пасля ўрагану, які прайшоўся ў сярэдзіне снежня па Беларусі, гродзенскім лясгасам спатрэбілася менш за два месяцы. Работа вялася хуткімі тэмпамі, было задзейнічана больш за 300 чалавек і дзясяткі адзінак спецыяльнай тэхнікі. Літаральна праз некалькі тыдняў пачнецца работа па ўзнаўленні пашкоджаных лясоў.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2022 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# НАША ЗАДАЧА — ДАНОСІЦЬ ПРАЎДУ



Фота БелТА.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА сустрэўся з ваеннаслужачымі 19-й асобнай гвардзейскай механізаванай Мікалаеўска-Будапешцкай Чырванасцяжнай, ордэна Суворава II ступені брыгады ў Заслонаве Лепельскага раёна.**

«Мая паездка не мае надзвычайнага характару. Я часта бываю ў розных калектывах. Сёння хачу пагаварыць аб тым, што хвалюе жыхароў краіны, адказаць на пытанні, якія ўзнікаюць у грамадзян», — сказаў Ігар Сергеенка.

Як адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, кожны год з'яўляюцца выклікі і пагрозы, з якімі даводзіцца змагацца, пераадольваць, улічваць у рабоце. «Сітуацыя, звязаная з правядзеннем спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, знаходзіцца ў цэнтры ўвагі, паколькі ў многіх з нас жывуць блізкія як ва Украіне, так і ў Расіі. Здавалася б, некалькі гадоў таму складана было ўявіць, што такое магло адбыцца, — канстатаваў ён. — На жаль, ва Украіне фактычна адбыўся пераварот у свядомасці людзей: краіна напампоўвалася радыкальнымі элементамі, прапагандаваліся нацыяцыянальныя ідэі, планамерна зніішчалася руская культура, разбуралася гістарычная памяць. І так званы дэмакратычны Захад не заўважаў жахлівых злачынстваў, якія здзяйсняліся там».

Ігар Сергеенка звярнуў увагу на мноства фэйкаў у інтэрнэце, якія датычацца сітуацыі ва Украіне. Так, паводле аднаго з іх, беларускія ваеннаслужачыя ваююць там у расійскай форме. «Складана разбірацца ва ўсіх гэтых хітрыках. Тым больш інфармацыйная зброя сёння, па сутнасці, знаходзіцца ў руках калектыўнага Захаду. Наша задача — у ходзе штодзённага ўзаемадзеяння даносіць праўду, у тым ліку бываючы ў розных калектывах», — сказаў ён.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта запэўніў жонак і маці ваеннаслужачых: абараняць Беларусь іх мужы і сыны будуць толькі на сваёй тэрыторыі.

«У Адміністрацыю Прэзідэнта на сёння паступіла каля 50 зваротаў з ацэнкамі сітуацыі ва Украіне. Яны розныя: з падтрымкай, з просьбай спыніць вайну. Напэўна, самая балючая тэма, якая чапляе, — гэта лёсы нашых дальнабойшчыкаў, кіроўцаў, якія спрабуюць пакінуць тэрыторыю Украіны». Літаральна ўчора ў нашу краіну вярнуліся 13 кіроўцаў. Вядома, без машын. Іх сустракалі сем'і», — расказаў Ігар Сергеенка.

Па лініі Міністэрства замежных спраў вядзецца работа па вяртанні беларусаў. «Людзі вярталіся праз Польшчу. Паводле нашых даных, звыш 200 чалавек знаходзіцца там. Робіцца ўсё магчымае, але гэта складана. Гэта дастаткова балючая тэма. Аднак я ўпэўнены: мы адтуль вернем усіх нашых людзей у выніку перагавораў», — падкрэсліў ён.

У час гутаркі таксама былі закрануты тэмы прыняцця на рэферэндуме абноўленага Асноўнага Закона, сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Грамадзян цікавілі пытанні адукацыі і аховы здароўя, арганізацыі гандлю, добраўпарадкавання населенага пункта, дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Паводле БелТА.**

# «Жанчына па сваёй прыродзе павінна быць міратворцам»

**Спікер верхняй палаты парламента сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Швейцарскай Канфедэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Крысцінай Хонегер-Залатухін.**



Фота БелТА.

Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі актуальны стан і перспектывы развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Швейцарыі ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, гуманітарнай і іншых галінах. Падчас гутаркі бакі адзначылі, што краіны маюць добры патэнцыял супрацоўніцтва, а таксама пацвердзілі зацікаўленасць у развіцці міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Вітаючы госцю ў Савеце Рэспублікі, яго Старшыня адзначыла, што рада асабістаму знаёмству з дыпламатам. Яна станоўча ацаніла рашэнне швейцарскага боку накіраваць пасла ў Беларусь.

— Тут вы зможаце разабрацца ў працэсах, якія адбываюцца, і пераканаецеся ў тым, што наша краіна заўсёды выступала і выступае за мір і згоду з усімі краінамі, якія па-добраму ставяцца да нас і нацэленыя на супрацоўніцтва. У гэтым няма ніякага сумнення, — сказала Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі выказала ўпэўненасць, што распачаўшы місію ў нашай краіне, дыпламат асабіста ўбачыць, як жыве беларускі народ, якія задачы на парадку дня, якія пытанні вырашаюцца ўнутры краіны.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу дыпламата на тым, што беларускія парламентарыі неаднаразова звярталіся да сваіх калег, дэпутатаў еўрапейскіх краін:

— Тады, калі ў 2020 годзе пачаўся, скажам, ціск на нашу краіну (звярнуліся. — **Заўв. аўт.**), для таго каб нас пачулі. Мы прапаноўвалі: прыедзьце, паглядзіце, давайце сустрэнемся, аб'ектыўна ацаніце падзеі, якія адбываюцца.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама ўхваліла той факт, што дыпламат распачала місію ў нашай краіне:

— Рада перш за ўсё, што вы — жанчына, таму што жанчыны крыху па-іншаму ўспрымаюць працэсы, якія адбываюцца. Жанчына па сваёй прыродзе павінна быць міратворцам, — адзначыла Наталля Качанава і выказала ўпэўненасць, што на месцы пасол зможа аб'ектыўна ацаніць сітуацыю ў Беларусі.

Таксама Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што праўда дайсці да нашай краіне павінна дайсці да тых краін, хто хоча яе пачуць, акцэнтаваўшы ўвагу на прыярытэце дзяржаўнай палітыкі ў Беларусі:

— Гэта людзі і справядлівае стаўленне да іх, — канстатавала Наталля Качанава. — Таму мы стараемся рабіць на карысць нашай дзяржавы, нашай краіны — суверэннай Беларусі, якой па мерках гісторыі зусім няшмат гадоў.

Са свайго боку Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швейцарскай Канфедэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Крысціна Хонегер-Залатухін адзначыла, што сваёй мэтай бачыць знайсці сумесныя тэмы, цікавыя абодвум бакам:

— У нас былі за гэтыя 30 гадоў розныя перыяды. Я думаю, нам трэба працаваць. Напэўна, без дыялогу — ніяк.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Дзмітрый ПІНЕВІЧ:

# «СІТУАЦЫЯ ДОБРАЯ. ТАКУЮ ФРАЗУ ВЫКАЗВАЮ ЎПЕРШЫНЮ»

## Міністр аховы здароўя станоўча ацаніў барацьбу з пандэміяй каранавіруса ў краіне

**Кіраўнік міністэрства правеў рабочую сустрэчу ў Гродзенскім абласным канкаме, азнаёміўся з ходам будаўніцтва анкадыспансера, узяў удзел у размеркаванні студэнтаў-медыкаў Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта.**



Як паведаміў Дзмітрый Піневіч, сітуацыя па ковіду дазваляе перапрафіляваць усе спецыялізаваныя ўстановы для работы ў звычайным рэжыме.

— Сітуацыя добрая. Такую фразу выказваю ўпершыню. Бо сёння мы маем менш за 20 % ад узроўню шпіталізацыі падчас мінулай хвалі. Мы татальна перапрафілюем усе спецыяльныя ўстановы для работы ў звычайным рэжыме. Змяншэнне колькасці паўторных пацыентаў дазваляе больш эфектыўна працаваць прафілактычнай медыцыне, — адзначыў міністр.

На яго думку, новыя ўспышкі каранавіруснай інфекцыі наўрад ці магчымыя. Хутчэй за ўсё, з восені сітуацыя пяройдзе ў фазу сезонных захворванняў.

— Гэта мы днямі абмеркавалі з пятнаццаццю нашымі вядучымі спецыялістамі-інфекцыяністамі, хоць прагнозы — справа няўдзячная, — падкрэсліў міністр. — Я ведаю, што з'яўляюцца новыя звесткі з Кітая аб тым, што на паўднёвым усходзе падымаецца новая хваля захворвання, але гэта звязана на крыху з іншай сітуацыяй. Там, дзе прымяняліся жорсткія каранцінныя меры, дзе пацыенты не былі ахоплены вакцынацыяй і не былі інфіцыраваны, скажам так, там атрымліваюць новую хвалю. У нас гэтага не было, у нас 62 % насельніцтва вакцынавана першым кампанентам, блізкія да гэтай лічбы і тыя, хто завяршае курс. Мы прыходзім да вясны, і я спадзяюся, што стаўлюся да сітуацыі аптымістычна. Разам з тым трэба быць гатовымі да любога варыянта. Таму варта не забываць пра вакцынацыю, а з ліпеня прапаную прайсці вакцынацыю, каб быць падрыхтаванымі да эпідсезона.

Па словах міністра, вакцын і ўвогуле медыцынскіх прэпаратаў і ў Гродзенскай вобласці, і ў цэлым па краіне хапае. Хоць фармацэўтычны рынак адрэагаваў на ажыятажны попыт на лекі ростам продажаў. Цяпер сфарміраваны новыя цэны, у тым ліку на імпартныя лекі, ажыятажу няма і няма перабояў. Закрыта пытанне па інсуліне і па некаторых гарманальных прэпаратах.

Назіраецца іншае: многія прэпараты выкупляюць тыя, хто прыязджае з-за мяжы. Гэтую сітуацыю міністэрства трымае на кантролі: каб папулярныя прэпараты даходзілі менавіта да беларускага насельніцтва. У той жа час прэпараты беларускай вытворчасці будуць даступныя і для замежнікаў.

Дзмітрый Піневіч акрэсліў і задачы, якія будуць стаяць перад беларускай медыцынай у сувязі з новымі выклікамі. Дарэчы, гэтыя аспекты ўнесены і ў дзяржаўную праграму дэмаграфічнай бяспекі.

— Па-першае, мы павінны быць гатовыя своечасова перападрыхтаваць па існуючых праграмах гатовых спецыялістаў, як і было падчас пандэміі, калі і тэрапеўты, і хірургі пры неабходнасці аказвалі медыцынскую дапамогу ў перапрафіляваных стацыянарах. Па-другое, у нас павінна быць моцная рэанімацыйная служба. Калі параўнаць рэанімацыю 2009 года і 2020 года — гэта дзве вялікія розніцы. Праведзена наймагутнейшая мадэрнізацыя, і цяпер гэтыя блокі нават у перыферыйных бальніцах зроблены на самым высокім узроўні. Гэты кірунак будзе падтрымлівацца і надалей, — падкрэсліў міністр.

Прычым і будаўніцтва, і мадэрнізацыя медыцынскіх устаноў будуць ісці такім чынам, каб пры неабходнасці было прасцей заніраваць як стацыянарныя, так і паліклінічныя ўстановы. Шлюзаванне будзе закладзена ў саміх праектах. Таму перапрафіляванне пройдзе амаль у аўтаматычным рэжыме. Для пераходу ў іншы рэжым работы дастаткова, што называецца, націснуць кнопку. Такім чынам будзе сфарміравана ўстойлівая і універсальная сістэма аховы здароўя, падсумаваў Дзмітрый Піневіч.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Факт

# Банкаўская картка, якая бесперабойна дзейнічае на тэрыторыі дзевяці краін

**Ужо сёння кліенты найбуйнейшага банка краіны могуць аформіць новыя картачныя прадукты на базе плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ. Гэта «Ізі-картка» і картка #можнаўсё. Аперацыі па гэтых картках Беларусбанка даступныя не толькі на нашай тэрыторыі, але і на тэрыторыі краін, дзе абслугоўваюцца карткі плацежнай сістэмы «Мир» (Расія, Арменія, Узбекістан, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Турцыя і В'етнам).**

Новыя карткі будуць цікавыя тым, хто хоча здзяйсняць безнаяўныя аперацыі як на тэрыторыі нашай краіны, так і за яе межамі і пры гэтым атрымліваць стабільны манібэк.

Мяркуйце самі. З «Ізі-карткай» можна атрымаць вяртанне 2 % ад сумы пры разліках у сферы забаў, рэстаранах і кафэ. З карткай #можнаўсё манібэк складзе 0,6 % пры разліку ў большасці арганізацый гандлю і сэрвісу. А калі разлічвацца ў арганізацыях-партнёрах, можна вяртаць да 12 % ад выдаткаваных сум.

Акрамя таго, уладальнікі «Ізі-карткі» могуць здымаць сродкі ў банкаматах любых банкаў-рэзідэнтаў нашай краіны на суму да 200 беларускіх рублёў у месяц без камісіі, а таксама аформіць спецыяльны анлайн-дэпазіт «Беларусбанк-анл@йн» у беларускіх рублях тэрмінам на 3 і 6 месяцаў.

Нагадаем, пры афармленні карткі ў сістэме «Інтэрнэт-банкінг» яе можна атрымаць, не выходзячы з дому — картку даставяць у паштовую скрыню.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Пасадзі «Дрэва героя»!

**З 26 сакавіка да 15 мая 2022 года па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў Беларусі стартуе акцыя «Дрэва героя» па закладцы паркаў, алей і садоў, высадка дрэў у памяць пра загінулых воінаў у месцах баявых дзеянняў, а таксама догляд за ўжо высаджанымі раслінамі. У ёй можа ўзяць удзел кожны жадаючы.**

Як падкрэслілі ў прэс-службе Мінпрыроды, нямала помнікаў на беларускай зямлі ўвекавечыла ў гісторыі трагедыю войнаў, памяць пра людзей, якія аддалі свае жыцці ў барацьбе з ворагам. Але ёсць і іншыя помнікі, жывыя, якія таксама нагадваюць пра ваенны час. Дрэвы — гэта нямыя сведкі, што захоўваюць памяць пра шчаслівыя імгненні і жахлівыя трагедыі. Гэта летапіс зямлі.

Сёння на тэрыторыі Беларусі расце дастаткова шмат дрэў-доўгажыхароў, якія могуць многае расказаць пра гістарычныя падзеі ў нашай краіне. Гэта дубы-веліканы ў Белавежскай пушчы, у заказніку «Фаліцкі Мох» Старадарожскага раёна, зялёны старажыл, што расце каля Бабруйскай крэпасці, пажэжынскі Цар-дуб — самы стары дуб Беларусі, які знаходзіцца ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці.

Для ўдзелу ў акцыі «Дрэва героя» трэба пакінуць заяўку ці звярнуцца ў абласны/гарадскі камітэт ці гарадскую/раённую інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Спецыялісты сістэмы Мінпрыроды пракансультуюць па правілах удзелу і разам з зацікаўленымі службамі арганізуюць пасадкі драўнінна-хмызняковай расліннасці на землях агульнага карыстання населеных пунктаў. Удзельнікаў таксама забяспечаць пасадачным матэрыялам і інвентаром.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

# «ПАСХАЛКУ» МАЦІ-ГІСТОРЫІ АДГАДАЛІ МАЗЫРСКІЯ ПАДЛЕТКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Дэталі гэтага сапраўднага краязнаўчага дэтэктыва раскрывае **настаўнік гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы № 12 Мазыра Ірына ФРАЛОВА:**

— Мы з вучнямі, якія любяць вывучаць гісторыю, бяруць удзел у алімпіядах па гэтым прадмеце, шукалі аб'ект, мазырскую гістарычную славутасць, каб прадставіць у якасці 3D-праекта, макета. Такую работу рыхтавалі на раённы конкурс па захаванні культурна-гістарычных каштоўнасцяў «Мазыршчына — Гомельшчына — Беларусь». Сярод старых паштовак Мазыра, што захоўваюцца доўгі час у нашым школьным кабінеце гісторыі, разам з вучнямі адшукала фатаграфію помніка. Але справа ў тым, што ніхто з нашых сучаснікаў-гараджан ніколі аб ім не чуў і не бачыў яго ў Мазыры.

Подпіс на паштоўцы вёў на мазырскую вуліцу М. В. Фрунзэ. Пасля ўрокаў Ірына Уладзіміраўна разам з вучнямі адправілася па адрасе, але помніка яны нідзе не знайшлі. Інтарэс разгадаць загадку гісторыі роднага горада ў дзяцей толькі распаліўся, працягвае настаўнік:

— Пошук у інтэрнэце нічога не даў. Звярнуліся ў бібліятэку. Фота нашага невядомага мемарыяла ўбачылі ў савецкім энцыклапедычным выданні «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі».

Высветлілася, што фота невядомага сучаснікам мазырскага гістарычнага аб'екта было нават на вокладцы першага нумара часопіса «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», які выходзіў у 1970-я гады. Каб адшукаць усю інфармацыю аб мемарыяле, настаўніца з вучнямі звярнуліся да спецыялістаў аддзела краязнаўства Мазырскай цэнтральнай бібліятэкі. Знайшлі звесткі ў старой перыёдыцы. Для гэтага прыйшлося пераглядзець падшыўкі газет за 50-я— 60-я гады мінулага стагоддзя. Вучням было цікава правесці сапраўднае гістарычнае расследаванне.

Даведаліся, што помнік, адліты з бронзы, адкрылі ў Мазыры ў 1957 годзе. Ён складаўся са скульптурнай кампазіцыі: чырвонаармеец, партызан і матрос. Манумент узвышаўся на пастаменце над 34 бетоннымі плітамі — брацкімі магіламі герояў Грамадзянскай вайны 1918-1920 гадоў. Раскрылася і гісторыя, чаму помнік быў устаноўлены менавіта на адной з вуліц Мазыра.

— На гэтым месцы ў ліпені 1920 года белапалякамі былі пакараныя падпольшчыкі. Помнік з'яўляўся напамінам пра тыя грозныя гады, калі беларускае Палессе было арэнай зацятых і жорсткіх бітваў Грамадзянскай вайны. Калі банды Пятлюры, Струка і Булак-Булаховіча, нямецкія і польскія інтэрвенты сеялі жах і смерць, пакідалі пасля сябе разрабаваныя вёскі і гарады, вісельні і папялішчы, — адзначае Ірына Фралова.

Даведаліся з перыёдыкі, што раней да помніка людзі прыходзілі пакланіцца героям, прыносілі кветкі. Пасля далёкая гістарычная нітка згубілася ў віры падзей. Дарогу да помніка пачалі забываць. Вучні з настаўніцай па ўказаным на паштоўцы адрасе прыйшлі зноў. Цяпер ужо адшукалі пастамент ад былога помніка і надмагільныя пліты — адзіны напамін аб брацкім пахаванні.

Вядома, што ў 1995 годзе бронзавую скульптурную кампазіцыю забралі на рэстаўрацыю. Далейшы лёс бронзавых чырвонаармейца, партызана і матроса невядомы. Адшукаць ніякіх звестак аб мемарыяле мазыране не змаглі. Але зноў пакінуць помнік толькі ва ўспамінах на ўроках гісторыі настаўніца з вучнямі не захацелі, вырашылі, што не маюць на гэта права, дзеліцца Ірына Фралова: «Гэта частка гісторыі нашага горада, нашай малой радзімы. Падзяка нашчадкаў героям, усім, хто адстойваў свабоду нашага народа».

Так пачалася работа па стварэнні макета помніка і падрыхтоўка відэастужкі пра яго гісторыю. Узнаўлялі выяву помніка па фатаграфіі на паштоўцы. Рабілі макет старшакласнікі-выпускнікі. У дзяцей, кажа настаўніца, і так, вядома, вучэбнай нагрузкі перад экзаменамі хапала, але работу не кідалі. Хлопцы на ўроках працоўнага навучання вытачылі з дрэва пастамент. Пасля зрабілі металічны каркас выявы помніка, а ўжо на яго нанеслі скульптурны пластылін, пафарбавалі. Асноўную работу па праекце ўзяла на сябе цяпер ужо выпускніца сярэдняй школы № 12 Мазыра Ульяна Бубнова. Можна толькі ўявіць, наколькі карпатлівую работу яна правяла. Напрыклад, мемарыяльную таблічку на помніку Ульяна аднавіла гліняным адбіткам-копіяй, якую сама адлівала.

— Наша гісторыя пра лёс помніка не пакінула нікога абыякавым на штогадовай навукова-практычнай канферэнцыі «Вялікія разумнікі» ў нашай школе. Слёзы стаялі ў вачах гледачоў, — дзеліцца Ірына Фралова. — Акрамя таго, тэма Грамадзянскай вайны і тых, хто думаў пра нас, пра светлую і шчаслівую будучыню, стала блізкай кожнаму ў зале, дзе праходзіў адкрыты рэгіянальны фестываль дзіцячай і маладзёжнай кінавідэатворчасці, прымеркаваны да Года народнага адзінства, прысвечаны гістарычнай спадчыне нашай краіны. Згаданае мерапрыемства праходзіла пад патранажам Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» і наша работа была адзначана дыпломам другой ступені.

Сёння вучні і педагогі школы спадзяюцца, што ў Мазыры з'явіцца адноўлены помнік. У Год гістарычнай памяці гэта асабліва важна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва гераіні.**

## Без тэрміну даўнасці

# Жалобны спіс кожны дзень папаўняецца

### Генпракуратура працягвае работу па выяўленні фактаў генацыду беларускага народа

**«З надыходам вясны, літаральна з наступнага тыдня, пачынаем далейшую работу па вывучэнні месцаў масавага знішчэння нашых грамадзян. Толькі на найбліжэйшыя паўгода ў нас каля двух дзясяткаў такіх месцаў. Гэтая работа будзе праводзіцца з прыцягненнем 52-га батальёна Міністэрства абароны», — паведаміў журналістам Генеральны пракурор Беларусі Андрэй ШВЕД.**

У першую чаргу плануецца даследаваць тыя мясціны, дзе былі найбольш масавыя расстрэлы, знішчэнне людзей. «Але ў цэлым будзе даследавана кожнае такое месца», — падкрэсліў генпракурор.

Ён таксама адзначыў, што завяршаецца практычная работа па ўстанаўленні ўсіх спаленых населеных пунктаў. Дапаўняецца інтэрактыўная карта, размешчаная на сайце Генеральнай пракуратуры. «Сумны спіс, на жаль, папаўняецца. Кожны дзень лічба (колькасць спаленых населеных пунктаў. — **Заўв. БелТА**) павялічваецца», — сказаў Андрэй Швед.

Папаўняецца і спіс карнікаў, якія жывыя. «Працуем з замежнымі дзяржавамі, прыходзяць адказы з шэрагу дзяржаў, звязаныя з тым, што нашы калегі ўдакладняюць тыя даныя. Мы разумеем, што гэту работу яны вядуць», — сказаў Андрэй Швед.

Ён нагадаў аб тым, што вядома ўжо пра больш як 400 жывых эсэсаўцаў у 17 краінах свету. «Прыбалты нам адмаўляюцца выдаваць. Яны адкрыта заявілі, што пакрываюць нацысцкіх злачынцаў», — сказаў Андрэй Швед.

Генпракурор паведаміў, што завяршаецца работа над спісам усіх карных падраздзяленняў з чэрвеня 1941 года. «Мы ведаем і найменне гэтых частак, і дзе якія карныя аперацыі яны праводзілі. Цяпер удакладняецца спісачны састаў канкрэтных удзельнікаў гэтых карных аперацый», — дадаў Генпракурор.

З улікам запланаваных змяненняў у крымінальна-працэсуальнае заканадаўства, якім прадугледжваецца ўвядзенне інстытута завочнай вытворчасці, рыхтуюцца матэрыялы да судовага працэсу ў Беларусі.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Андрэй Швед удакладніў: судом ад імя Рэспублікі Беларусь будзе прынята рашэнне ў адносінах да канкрэтных злачынцаў, якія не панеслі пакаранне за ўчыненыя дзеянні. «Мы апішам дзеянні кожнага з іх як у складзе карных падраздзяленняў, так і, калі будзе доказная база, індывідуальна вылучым дзеянні асобных карнікаў. На жаль, такіх даных вельмі шмат», — расказаў ён.

Таксама Генпракурор паведаміў: «Мы ініцыіравалі (і завершым гэту работу ў найбліжэйшыя дні) стварэнне экспазіцыі, прысвечанай генацыду, практычна ў кожным раённым цэнтры. У Магілёўскай вобласці такая работа завершана, у Мінскай — завершыцца да канца сакавіка. Плануецца, што да канца сакавіка ў кожным раённым цэнтры будзе экспазіцыя, прысвечаная генацыду ў цэлым на тэрыторыі БССР і ў дачыненні да кожнага раёна ў прыватнасці. Таму што няма такога раёна, дзе б не знішчалі людзей», — сказаў Андрэй Швед.

Генпракурор падкрэсліў: тэзіс аб тым, што Беларусь — вялікая брацкая магіла, не моўная фігура. «Так яно і ёсць. Фактычна ўся тэрыторыя — суцэльныя пахаванні», — адзначыў Андрэй Швед.

**Паводле БелТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Барабанаву Дзмітрыю Іванавічу, начальніку галоўнага эканамічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МВФ лічыць сітуацыю ва Украіне сур'ёзным ударам па сусветнай эканоміцы

**Міжнародны валютны фонд (МВФ) лічыць сітуацыю ва Украіне сур'ёзным ударам па сусветнай эканоміцы, які нанясе ўрон яе росту і прывядзе да павышэння цэн ва ўсім свеце. Аб гэтым гаворыцца ў апублікаваным у блогу фонду артыкуле, адным з аўтараў якога з'яўляецца дырэктар еўрапейскага дэпартамента МВФ Альфрэд Камер, паведамляе ТАСС.**

«Гэты канфлікт — сур'ёзны ўдар па сусветнай эканоміцы, які нанясе ўрон росту і прывядзе да павышэння цэн», — адзначаецца ў артыкуле. «Хоць некаторыя наступствы могуць не выявіцца ў поўнай меры на працягу многіх гадоў, ужо цяпер ёсць відавочныя прыкметы таго, што вайна (спецаперацыя РФ ва Украіне. — **Заўв. БелТА**) і выкліканы ёю скачок цэн на тавары першай неабходнасці ўскладняць для палітыкаў у некаторых краінах пошук тонкага балансу паміж стрымліваннем інфляцыі і падтрымкай эканамічнага аднаўлення пасля пандэміі», — дадалі аўтары дакумента. У артыкуле падкрэсліваецца, што МВФ мае намер перагледзець свае прагнозы росту сусветнай эканомікі ў бок паніжэння ў дакладзе аб яе перспектывах развіцця, які будзе апублікаваны ў наступным месяцы.

### У Даніі разглядаюць вечную забарону на продаж цыгарэт усім, хто нарадзіўся пасля 2010 года

**Міністэрства аховы здароўя Даніі аб'явіла аб планах забараніць продаж тытунёвай прадукцыі грамадзянам краіны, якія нарадзіліся пасля 2010 года нават тады, калі яны дасягнуць паўналецця. Пра гэта паведамляе The Guardian.**



Сёння права куплі тытунёвай прадукцыі, а таксама электронных цыгарэт ёсць у датчан, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў. «Мы спадзяёмся, што ўсе грамадзяне, якія нарадзіліся ў 2010 годзе і пазней, ніколі не пачнуць курыць ці ўжываць прадукты на аснове нікатыну. У выпадку неабходнасці мы гатовыя забараніць продаж гэтаму пакаленню шляхам паступовага павышэння ўзроставага цэнзу», — заявіў журналістам міністр аховы здароўя Магнус Хойнікэ. Сёння прыблізна 31 % датчан ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў курыць.

### Пяскоў назваў канфіскацыю маёмасці грамадзян РФ на Захадзе крахам святасці прыватнага бізнесу

**Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў пракаментаваў канфіскацыю маёмасці расійскіх прадпрымальнікаў на Захадзе на фоне ўведзеных антырасійскіх санкцый.**

«Канфіскацыя іх маёмасці, арышты самалётаў, уласнасці, якая належыць ім, — гэта выразна дэманструе, напэўна, крах усёй гэтай святасці прыватнай уласнасці і прыватнага бізнесу. І дэманструе небяспеку вядзення бізнесу там», — сказаў прадстаўнік Крамля. Раней паведамлялася, што казначэйства Бельгіі замарозіла расійскія актывы на 10 млрд пасля санкцый Еўрасаюза супраць фізічных асоб і арганізацый з Расіі. Таксама прэм'ер-міністр Польшчы Матэуш Маравецкі па выніках перагавораў кіраўнікоў урадаў Люблінскага трохвугольніка (Польшча, Літва, Украіна) заявіў, што фонд аднаўлення Украіны павінен будавацца на базе канфіскаваных расійскіх актываў.

Фінансы

## АДТЭРМІНОЎКІ ПА ПАГАШЭННІ КРЭДЫТАЎ І АДСУТНАСЦЬ ШТРАФАЎ

**«Беларусбанк» уводзіць дадатковыя меры па падтрымцы крэдытаатрымальнікаў**

**Такім чынам, найбуйнейшае фінансавае падраздзяленне краіны істотна пашырае меры па зніжэнні крэдытнай нагрузкі на кліентаў.**

Варта нагадаць, што зусім нядаўна гэты банк прыняў рашэнне да канца года зафіксаваць працэнтныя стаўкі па крэдытах на фінансаванне нерухомасці, якія аформлены да першага сакавіка бягучага года. І цяпер банк вырашыў працягнуць змякчаць складаную крэдытную абстаноўку для некаторых сваіх кліентаў.

Па заяве кліента можна аформіць адтэрміноўку да 6 месяцаў па пагашэнні асноўнага доўгу па спажывецкіх крэдытах і па крэдытах на нерухомасць (за выключэннем крэдытаў, дадзеных з дзяржаўнай падтрымкай і спажывецкіх крэдытаў з прыняццем у якасці забеспячэння страхавання рызыкі невяртання крэдыту). Адтэрміноўка афармляецца з улікам асаблівасцяў кожнага крэдытнага прадукту. Пры гэтым тэрмін пагашэння крэдыту павялічыцца на 12 месяцаў.

Таксама кліенты банка могуць падоўжыць на 12 месяцаў тэрмін пагашэння авердрафтнага крэдыту, па якім спынена прадастаўленне пазыкі.

Больш за тое, цяпер банк не будзе прымяняць штрафы, прадугледжаныя крэдытнымі дагаворамі і дагаворамі забеспячэння (акрамя штрафаў, звязаных з наяўнасцю пратэрмінаванай запазычанасці), па падставах, якія ўзніклі да 31 снежня бягучага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Па сутнасці

# НА НУЛЯВЫМ ПАВЕРСЕ



Кажуць, душа як камень. На жаль. Ёсць душы нібыта каменныя. Але, дзякуй богу, ёсць камяні, у якіх жыве душа. Душа народа. Напрыклад, дакранешся да мураванкі ў Сынкавічах альбо да сцен Камянецкай вежы, яе называюць яшчэ Белай — ахрышчана, падобна як і наша краіна, бо нескароная, чыстая. Прамінулі эпохі, прайшлі стагоддзі, а ворагі нашага народа не пакінулі гуманістычных (сёння гэта так называюць) ідэй запэцкаць беларусаў. У палітычным брудзе выкачалі душы, сэрцы і розум маладых, а таму гарачых беларусаў.

Чаму іх ашукалі? Укралі спадчыну? А потым ужо ўклалі атручаныя заходнія паняцці. Згадваю гастранамічную споведзь гурмана з пакалення «Z», знатака заморскага фаст-фуду. «Ведаю, што шкодна, але не магу — цягне, аж у роце казыча». Атруціі, ашукалі гэтае вечнае памкненне маладосці — прагу да праўды. Праўду падмянілі зманлівай карцінкай.

Псіхолагаў у школах ды ўніверсітэтах хапае, а сапраўдных гарманічных асоб — дэфіцыт. Дзе былі бацькі, настаўнікі, прарэктары па выхаваўчай рабоце... Ідэолагі? У чэргах варшаўскіх «бідронкаў», на калядных кірмашах Прагі, у плётках сусветнага павуціння. Вось таму страцілі сувязь з будучым пакаленнем, а потым ужо гэтае пакаленне спачатку згубіла сябе, а потым і Спадчыну продкаў.

Згодны, што, вядома ж, перабольшваю. Хапае разумных, кемлівых, моцных. Пакаленне не страціл. Будучыню не згубілі. Але што рабіць з той часткай фрылансераў мяцяжу, коўч-менеджараў па пошуках пратэсных ботаў — вечных мастакоў. І гэта нават не назва прафесіі ці роду заняткаў. Гэта вызначэнне стылю жыцця. Пошукі сябе выліваюцца ў незадаволенасць рэчаіснасцю, на вуліцы, у спробы збегчы некуды.

Збеглыя... Як трапна сказана. І палітыка толькі адлюстроўвае хваробу індывідуальнасці. Якую ўжо зруйнавалі тэхналогіі. Адшліфавалі. Да страшэннага. Некалі фантасты апісвалі камуністычны апакаліпсіс як чалавека без твару і нават ценю. Шэрая маса. У шэрую масу грамадскасць ператвараецца заходнім капіталізмам. Усё абязлічана — сняданак, адзенне, нават думкі і дзеянні. Словы і тыя — аднатыпныя. Ды што словы — мары. Нібыта тое не мары чалавека, а нейкая агульная камп'ютарная праграма, спам сусветнага маштабу, мана і хлусня заходняй цывілізацыі.

Падманулі і ашукалі нашых збеглых. Яны хацелі, як на Захадзе. На Захадзе яны і апынуліся. Бацькі, універсітэты, дзяржава — апякалі. Фонды па падтрымцы талентаў, гарантаванае першае рабочае месца, ільготы маладым сем'ям і бацькам. Сапраўды — дыктатура. Хацелася стрэсці гэтую апеку. Залішнюю. Стрэслі. А адчуванне — нібыта не апеку стрэслі, а футра ў траскучыя маразы.

Збеглыя ехалі, вобразна кажучы, у «эўрапэйскі гатэль» для адэптаў заходніх каштоўнасцяў, а апынуліся ў хоспісах для бежанцаў. Прыбіральшчыцы, разносчыкі піцы — гэта зусім не тыя кампетэнцыі, аб якіх марылі носьбіты палітычных свабод. У літоўскіх, польскіх ды чэшскіх дэмакратыях сацыяльныя ліфты, мабыць, і працуюць, але на нулявыя паверхі яны не апускаюцца.

Што казаць, калі заходнія данаты абрэзалі нават для самых светлых твараў пратэсту. Тых, хто на вяршыні харчовай піраміды беларускай калабарацыі. Слова якое трапнае. Цяпер яно моднае, трэндавае, не сыходзіць з вуснаў збеглых. Праўду кажуць — калабарацыя. Калабарацыя — ад жудаснага з часоў вайны калабарацыянізму.

Неверагодныя імёны «супраціву» забываюцца, пераможныя плЯны рушацца. Капіталісты не дачакаліся дывідэндаў. Акцыянернае таварыства палітычных сектантаў «Ціханоўская» і аб'яданне з абмежаванай адказнасцю перад збеглымі лузерамі «Латушка» — банкроты. Увогуле — дэфолт у гэтым каралеўстве крывых люстэркаў. Больш ніякіх плюшак. Нават з рук падпанкаў, не кажучы ўжо пра пана з Белага палаца. Калі гэтак абыякава да твараў пратэсту, то як тады да ўсіх астатніх? Да масы.

Чаму цяпер так мала пагроз і ганебных, брыдкіх каментарыяў ад збеглых? Бо ў значнай часткі няма нават грошай на мабільны інтэрнэт. І без таго прыніжанае становішча і маленькія заробкі — пагаршаюцца. Не спраўдзілі надзей.

Беларускія прадпрыемствы працуюць. Чыгунка не знішчана. Нават сакральныя забойствы не здзейснены. Ніводны з цэнтраў беларускага пратэсту не выканаў праграму-мінімум. Максімум: гэта калі б Заходняя Беларусь у складзе Польшчы, а ўсе буйныя дзяржпрадпрыемствы — у складзе заходніх транскарпарацый. Вогнішча на інфернальным алтары амаль згасла.

Вось пішу і думаю, ці дайшло гэта да неверагодных. Што іх мары пра тое, каб змяніць карцінку, зусім не супадаюць з той карцінкай, якая перад вачыма ў спонсараў па знішчэнні Беларусі. Мабыць, не ўсе ўцямілі. І думаюць знайсці долі на чужым полі.

Заморскі цмок застаўся галодным. Беларусь не праглынуў. Ласуецца Украінай. Таму менавіта ўвага да ўкраінцаў. Яны сёння ў цэнтры барацьбы са славянскім светам. Кажуць, мільён ужо ў Еўропе. Мары майдана спраўджваюцца. Украіна ў Еўропе.

А беларусы — да беларусаў нікому справы няма. Паказная еўрапейская гасціннасць сыходзіць у гісторыю. Нашых збеглых не вельмі ласкава просяць браць манаткі ды да хаткі. Звальняюць з работы, адлічваюць з універсітэтаў. Нават па-мюнхенску паводзяць з некаторымі нашымі дзяўчатамі. Дэмакратыя. Больш бчб-героям няма месца пад палаючым сонцам сусветнай дэмакратыі. Нават у якасці прыслугі няма месца. Жыццёвы прастор ніжніх паверхаў еўрапейскай рэчаіснасці рыхтуюць для бежанцаў. Не толькі з Украіны. Сярэдняя Азія, Блізкі Усход. Там больш тлеючых канфліктаў, чым зорак на сцягу ЗША...

Таму беларускія змагары сыходзяць з мядыйнага парадку дня. Інтарэс згас. І больш нікога не ўражвае палітычны флэшмоб. Змагарскія гастролі больш не збіраюць гледачоў. Гэта фіяска. Фініта ля камедыя.

Не, пачакайце. Ёсць шанц застацца сапраўдным барацьбітом за «эўрапэйскасць». Стаць гарматным мясам у складзе ўкраінскіх нацбатаў. Прадажная і несумленная Ціханоўская. Тая самая, што падманвае беларускіх маці наконт нашых вайскоўцаў ва Украіне. Тая самая, што заклікае дзеля міру знішчаць беларускія прадпрыемствы і цягнікі. Яна заклікае і збірае ўсіх беларускіх змагароў замежжа ісці ваяваць за Зяленскага. І тых, каго цягне ехаць у замежжа, нібыта хавацца ад вайны, на гэтую ж вайну і кідае...

Змяя, каб не быць забітай, выгінаецца як можа. Тое ж самае робяць вярхі змагарскай калабарацыі. Каб іх вантроба не засталася без палітычных грантаў, яны падманам і хлуснёй запрашаюць новых ахвяр свайго ДЭМАНАкратычнага ашукальніцтва, палітычнага махлярства.

Але тое ўжо канвульсіі. Яны адыгралі сваю «спектаклю». Засталіся без апладысментаў. А вось тыя, хто падмануўся, засталіся ўсё ж з надзеяй вярнуцца ў хату бацькоў. Да Нястрачанай Спадчыны.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# КАБ ІЗНОЎ ШУМЕЛІ КРОНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гродзенскаму рэгіёну, можна сказаць, пашанцавала. Разгул стыхіі хоць і не абмінуў яго тэрыторыю, але пацярпелая плошча не такая вялікая, як у іншых абласцях краіны. Між тым 63 гектары лесу аказаліся пад буралом. Але не толькі. Як паведамілі ў абласным лесагаспадарчым аб'яднанні, у першую чаргу аператыўна вырашаліся пытанні па дрэвах, якія падалі на лініі электраперадачы ў лясных масівах. А такіх налічвалася амаль сотня. Яшчэ некалькі дзясяткаў дрэў прыйшлося хутка прыбраць з аўтамабільных дарог. Для выяўлення пашкоджаных участкаў задзейнічалі верталёты МНС і квадракоптары.

— Пасля таго як прайшлі дзве хвалі моцнага шквалістага ветру, былі арганізаваны агляды лясного фонду. Абследаванне вялося як наземным спосабам, так і з паветра. Інфармацыя аб пашкоджаных участках накіроўвалася ў адпаведныя лясгасы, — паведаміў **начальнік аддзела лясной гаспадаркі і лесааднаўлення Гродзенскага лесагаспадарчага аб'яднання Андрэй БУЙ.**



Найбольш пацярпелі ад урагану лясы некаторых заходніх і паўночных раёнаў вобласці. На гэтых участках была праведзена суцэльная высечка ў аб'ёме каля дваццаці тысяч квадратных метраў. Акрамя таго, яшчэ столькі ж прыбрана адзінкавых паваленых і аварыйных дрэў. Работа вялася інтэнсіўна. Было задзейнічана некалькі дзясяткаў машын, у тым ліку харвестары, лесавозы, форвардары.

— Таксама мы далі магчымасць насельніцтву нарыхтоўваць на гэтых участках дровы сваімі сіламі. Многія так і зрабілі. Інфармацыя аб канкрэтных участках размяшчалася на афіцыйным сайце нашага аб'яднання, а таксама ў лясгасах па месцы жыхарства, — паясніў супрацоўнік ведамства.

Усе прынятыя меры дазволілі справіцца з наступствамі буралому ўжо да пачатку сакавіка. А на ўчастках, дзе адбылася суцэльная высечка, вясной пачнецца пасадка новых дрэў. Плануецца ўзнавіць усе 63 гектары пашкоджанай плошчы. У асноўным — традыцыйнымі хвойнымі і ліставымі пародамі. Пасадачны матэрыял вырошчваецца ў гадавальніках вобласці. Сёлета плануецца высадзіць каля 30 мільёнаў сеянцаў і саджанцаў.

Як расказала **вядучы інжынер па лесааднаўленні Гродзенскага лесагаспадарчага аб'яднання Інга УЮНОВА,** штогод у вобласці засаджваецца новымі дрэвамі да чатырох тысяч гектараў. Сёлета гэтая плошча будзе павялічана з-за пашкоджаных ветрам участкаў. Таксама пасадка вядзецца на малапрадукцыйных пашкоджаных землях, якія перадаюцца леснікам гаспадаркамі. Такія землі прымаюцца штогод.

— Гэта землі, якія ніяк не выкарыстоўваюцца, у асноўным няўдобіцы, дзе няма ніякіх пад'ездаў для сельскагаспадарчай тэхнікі, таму іх немагчыма апрацоўваць. Таксама ў лясны фонд пераходзяць адпрацаваныя кар'еры, тарфянікі, звалкі. Апошнім часам звалкі сталі актыўна ліквідавацца, на іх месцы таксама будзе пасаджаны лес, — адзначыла спецыяліст.

Трэба сказаць, што якраз гэтай вясной завяршаюцца пасадкі саджанцаў пасля разгулу яшчэ адной стыхіі, якая нанесла значныя страты лясному фонду. Амаль тры гады таму ў Гродзенскім раёне пажарам было знішчана 700 гектараў лесу. Узнаўленне вядзецца паступова, бо на гарэлай тэрыторыі адбываецца моцнае выдзяленне смалы, якая прываблівае шкодных насякомых. Таму пасадкі тут пачаліся толькі праз год. Дарэчы, з удзелам шырокага кола валанцёраў і многіх арганізацый ды ўстаноў. Агульнымі намаганнямі ўдалося амаль поўнасцю ўзнавіць згарэлы лес. У асноўным такімі пародамі, як хвоя і бяроза. Гэта тое, што расло тут да пажару.

Трэба сказаць, што пры аднаўленні лясоў існуе пералік парод, якія дазволена вырошчваць у лесе. У Гродзенскай вобласці пераважную плошчу займаюць хвойныя лясы. Таксама ў ліку найбольш распаўсюджаных — бяроза, елка, чорная вольха і дуб. Апошнім часам плануецца ўводзіць новыя пароды. Напрыклад, піхту белую. Пакуль такіх плантацый дзве ў вобласці, менавіта з іх у будучым плануецца сабраць насенне.

Дарэчы, у рэгіёне ёсць і свой лесанасенны цэх, дзе перапрацоўваюць хваёвыя і яловыя шышкі. Насенне захоўваецца ў халадзільніках і з'яўляецца стратэгічным запасам на будучыню. Бо не кожны год удаецца сабраць добры ўраджай, бывае і зусім «пусты» на насенне з-за нашэсця шкоднікаў альбо неспрыяльных кліматычных умоў.

І хоць тэрыторыя лясоў даволі значная — у Гродзенскай вобласці яна займае 38 % усёй плошчы, — лясны фонд часта падвяргаецца ўплыву розных неспрыяльных знешніх фактараў. Гэта і буралом, і пажары, і шкодныя насякомыя. Апошнім часам уплыў аказвае змяненне клімату: пацяпленне адчуваюць хвойныя пароды дрэў. Таму ў вобласці актыўна вядзецца работа па лесааднаўленні. Штогод з'яўляецца 4-5 тысяч гектараў новых пасадак.

Добрай ініцыятывай па аднаўленні лясоў стала правядзенне штогадовага Тыдня лесу, да якога далучаюцца многія ўстановы, прадпрыемствы і проста нераўнадушныя грамадзяне. Сёлета акцыя па пасадцы стартуе ў пачатку красавіка. Інфармацыя аб яе правядзенні будзе даступная на сайтах лясгасаў і СМІ.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Сямейная газета
Выпуск № 5 (187)

# ПЕРШЫЯ СЯБРЫ

*Першае, што зрабіў мой амаль чатырохгадовы сынок, калі апошні раз прыехаў у вёску, — распрануўся і пастукаўся ў дзверы да суседзяў. Калі яму адчынілі, спытаў, ці прыехала да бабулі і дзядулі Паліна. Пачуўшы станоўчы адказ, доўга не думаючы, запрасіў дзяўчынку ў госці...*

*Паліна прыйшла. Хату маіх бацькоў з ног на галаву, як год таму, не перавярнулі, але гулялі шмат у што і з чым. Паліне — сем. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, ім было весела і, спадзяюся, цікава.*

*На наступны дзень Арцём не паспеў прачнуцца, як заявіў: «Я паклічу Паліну ў госці!» Мы з маёй мамай пераглянуліся і пагадзіліся, але перш Цёмік павінен быў памыцца і паснедаць. Клікаць дзяўчынку ён пайшоў сам. Цікава было назіраць, як ён запрашае суседку ў госці, як чакае тую, якая паабяцала прыйсці праз паўгадзіны, потым як гуляе і размаўляе з ёй.*

*Як хутка бяжыць час! У Арцемія ўжо з'явілася патрэба праводзіць час з кімсьці яшчэ, акрамя як з бацькамі, бабулямі ды дзедам. Ён нарэшце навучыўся гуляць з дзецьмі. Да нядаўняга часу мае сустрэчы з сяброўкамі, якія таксама гадуюць малых, былі своеасаблівым выпрабаваннем. Дзеці забіралі адзін у аднаго цацкі, кожны займаўся нечым сваім, не звяртаючы ўвагу на іншага. Трэба было сачыць за тым, каб хтосьці кагосьці не пакрыўдзіў, не піхнуў, не стукнуў.*

*Сваю справу ў пытанні сацыяльных узаемаадносін зрабіў, вядома, дзіцячы садок. Там «разборкі» накшталт таго, хто будзе гуляць з пэўнай цацкай, вырашаюцца вельмі хутка. І праседзець аднаму за пэўнай забаўкай таксама не атрымаецца — хочаш не хочаш, а знойдзецца кампанія. У майго Цёміка ў садку ажно два лепшыя сябры — Ягор і Мацвей. І калі першы час сын нярэдка скардзіўся, што то адзін, то другі хлопчык не хоча з ім дзяліцца машынкай ці самалётам, то сёння ў нас нават размоў такіх не ўзнікае. Арцём часам сам знаходзіць цікавае выйсце з падобных сітуацый.*

*Не так даўно, напрыклад, азадачыў нас з мужам, каб мы купілі яму цягнік, які ён возьме ў дзіцячы садок — тады, маўляў, Ягор з ім падзеліцца сваім. «Дык навошта тады табе будзе патрэбны Ягораў цягнік, калі ў цябе свой?» — не маглі мы зразумець логіку трохгадовага сына. «Трэба», — пачулі кароткае ў адказ. Цягнік не купілі, аргументуючы тым, што ў яго і так зашмат цацак. На гэта Цёмік заявіў, што купіць цягнік сам — яму ж дзядуля з бабуляй, калі ён быў у іх у гасцях, грошай далі! У выніку ў панядзелак у садок ён пайшоў з новай цацкай. Выхавальніца сказала, што ў іх арганізоўваецца «паравознае дэпо»: з новым цягнікам прыйшоў яшчэ і Мацвей.*

*З дзяўчынкамі Цёмік у садку чамусьці сябраваць не любіць. А вось калі няма хлопцаў, то знаходзяцца агульныя інтарэсы і з імі. Галоўнае, каб не адзін. Днямі ў госці сябры прыходзілі са сваім сынам. Ільюшу — паўтара года. Яшчэ нядаўна Цёму абсалютна не цікавіла наяўнасць маленькага: ні пагуляць з ім, ні паразмаўляць. Апошнім жа разам, гляджу, тактыка змянілася. Арцём ужо сам прапаноўвае яму цацкі, а калі Ільюша бярэ машынку, патрэбную самому, не выдзірае, як раней, з рук, а ветліва просіць яго памяняцца на іншую. Мы з сяброўкай, шчыра кажучы, уздыхнулі, што дзеці, нарэшце, знайшлі адзін з адным агульную мову.*

*Гэта абсалютна нармальна, калі бацькі хвалююцца, ці зможа іх дзіця з кімсьці пасябраваць. Асабліва востра пытанне стаіць, калі малечу адпраўляюць у дзіцячы садок або школу. Псіхолагі сцвярджаюць: для большасці дарослых здольнасць іх дзяцей з лёгкасцю знаходзіць сяброў — прыкмета іх уласнай псіхалагічнай упэўненасці. Паверце, гэта вельмі важна, калі бацькі ўпэўнены ў тым, што іх дзіця не будзе адчуваць сябе разгубленым або адзінокім у незнаёмым асяроддзі. Днямі, напрыклад, пасля праведзенага ў сувязі з хваробай тыдня дома Арцемій з мокрымі ад слёз вачыма ішоў у садок: за гэтыя дні адвык. Сэрца маё сціскалася, але раптам я супакоілася: не паспеў малы распрануцца, як сябры пачалі абдымаць Арцёма і расказваць, у што яны будуць гуляць.*

*І па вялікім рахунку няважна, што адзін з гэтых хлопчыкаў навучыў майго малога парачцы дрэнных слоў. Я, безумоўна, растлумачыла сыну, што так казаць нельга, і ўжо правяла прафілактычную гутарку з мамай таго хлопчыка. Але галоўнае, што Цёмік забывае пра слёзы, калі яго бачыць, і з вялікай ахвотай прачынаецца ранкам і спяшаецца ў садок, каб Ягор без яго не сумаваў. А яшчэ Цёма чакае сябра ў госці, хоць жыве той, мякка кажучы, далекавата.*

**Вераніка КАНЮТА.**

## Тыя, хто побач



Спявак Леуш ЛЮБІЧ з жонкай Вольгай і сынамі Мікітам і Мацвеем.

**Леуш ЛЮБІЧ:**

# «УДЗЯЧНЫ ЗА ЎСЁ І ЎСІМ!»

Ён пераадолеў шмат цяжкасцяў на сваім шляху да творчасці і сямейнага шчасця

**Візітка нашага героя — песня «Акардэон уначы», дзякуючы якой у свой час яму дала зялёнае святло сама Прымадонна. Многія памылкова прымаюць артыста за серба ці літоўца, але ж ён наш. Радзіма яго — прыгожы гарадок Баранавічы. У нашай размове спявак расказаў пра выпрабаванні, якія выпалі на яго лёс, і пра поспехі, што прыносяць радасць.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. СГ».)*

## Бацькоўскі клуб

# ЯК ПАДРЫХТАВАЦЬ ДЗІЦЯ ДА ШКОЛЫ?

## Не перашкаджайце яму... гуляць!

**Многія бацькі падрыхтоўку да школы зводзяць выключна да ўмення чытаць, лічыць і пісаць. Насамрэч не трэба спадзявацца, што авалоданне гэтымі навыкамі забяспечыць дзіцяці будучыя поспехі і камфорт у школе. Больш за тое, калі сілком заганяць малых за чытанне і прымушаць гадзінамі выводзіць палачкі і кручочкі, можна моцна нашкодзіць. Ваша віна будзе не толькі ў тым, што дзіця пачало негатыўна ставіцца да школы. Куды страшней, калі вы сваёй псеўданастаўніцкай «працай» перашкаджаеце маленькаму чалавечку пазнаваць свет.**



### ТЫСЯЧЫ «ЧАМУ?»

Дзеці па прыродзе вельмі цікаўныя. І калі ў вас расце «чамучка» працэс падрыхтоўкі да школы значна спрашчаецца. Паказвайце, што кожнае яго пытанне мае вагу. Калі не ведаеце адказаў самі, падказвайце, дзе можна разам іх пашукаць: запытацца ў бацькі (бабулі, дзядулі), зазірнуць у энцыклапедыю, узяць кніжкі па пэўнай тэме ў бібліятэцы ці знайсці ў інтэрнэце. Так вы будзеце вучыць дзіця слухаць, аналізаваць, шукаць, запамінаць.

Падчас прагулак на свежым паветры звяртайце ўвагу на нумары дамоў і назвы вуліц, шыльды — без асаблівага напружання навучыце дзіця разбіраць лічбы, патрэніруйце ў чытанні, у дадатак патлумачце, як веды могуць быць карыснымі.

Нават паход у краму здольны замяніць урок па матэматыцы: разам падлічыце, колькі тавараў вы паклалі ў кошык, колькі чалавек стаіць у чарзе да касы, а самыя прасунутыя малыя змогуць паспрабаваць вызначыць кошт пакупкі.

Назірайце за птушкамі і раслінамі, а яшчэ — як мяняецца ваш любімы парк у розны час года, у які дзень тыдня вы туды ходзіце гуляць, ці змянілася нешта пасля таго, як вы сюды завіталі апошні раз. А пасля прагулкі няхай дзіця падзеліцца ўражаннямі: дзе было, што бачыла. Так развіваецца памяць і канцэнтрацыя, уменне заўважаць дэталі і пераказваць, што, бясспрэчна, спатрэбіцца на ўроках па такіх прадметах, як «Літаратура» і «Чалавек і свет».

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сітуацыя

# КЛЮЧ ДА ТАЯМНІЦЫ

## Ад 23 да 30 % мужчын атрымліваюць адмоўны вынік ДНК-тэста на бацькоўства

**Хто і навошта падбірае «генетычны ключ» да таямніцы бацькоўства і ці варта давяраць выніку ДНК-тэста, мы спыталі ў спецыяліста ў галіне генетычных даследаванняў Цэнтра генетыкі «Наследие» Лізаветы Васілеўскай.**

**Генетычныя даследаванні даюць шырокі спектр магчымасцяў. Напрыклад, экзомнае і геномнае секвеніраванне, выяўленне схільнасці да спадчынных захворванняў, устанаўленне наяўнасці або адсутнасці храмасомных паталогій плода, дыягностыка і ўдакладненне прычын тых ці іншых хвароб, чые вытокі трэба шукаць на генетычным узроўні... Генетыкам сёння пад сілу вельмі многае: скласці генетычны пашпарт, вызначыць здольнасці да заняткаў пэўнымі відамі спорту... Але, мабыць, найбольш часты запыт грамадства да генетычных лабараторый — гэта ўстанаўленне бацькоўства.**

### Працэдура простая, але...

— ДНК-тэст на бацькоўства запатрабаваны ў любыя часы. Што б ні адбывалася ў свеце, тэст на бацькоўства нязменна цікавіць і мужчын, і жанчын: запыты — штодзённыя, нягледзячы на выхадныя і святочныя дні. Людзі хочуць ведаць праўду, і, як паказвае практыка, не шкадуюць для гэтага ні часу, ні грошай, — кажа Лізавета Васілеўская.

Працэдура здачы генетычнага матэрыялу простая: спатрэбіцца ўсяго толькі тры ватныя палачкі і папяровы канверт. Стандартным узорам з'яўляецца букальны эпітэлій — прасцей кажучы, мазок з унутранага боку шчакі. Дастаткова правесці ватнай палачкай па слізістай зверху ўніз, тры разы па адной шчацэ, тры разы — па другой. Можна зрабіць гэта дома, выкарыстоўваючы самыя звычайныя ватныя палачкі, можна прыехаць у цэнтр. З дадатковых умоў — неабходна ўстрымацца ад ежы, ужывання фарбавальных напояў і курэння на працягу паўгадзіны перад узяццем узораў, каб яны былі цалкам прыдатныя для даследавання.

Робіцца ДНК-экспертыза на ўстанаўленне бацькоўства на працягу пяці рабочых дзён і каштуе 325 рублёў, калі ўдзельнікаў двое — бацька і дзіця. За дадатковых удзельнікаў даследавання давядзецца даплаціць (205 рублёў за другое дзіця, па 100 рублёў пачынаючы з трэцяга). Работа з нестандартнымі ўзорамі абыдзецца заказчыку даражэй, тэрміны даследавання павялічацца.

Генетыкі часам сутыкаюцца з сітуацыямі, калі стандартны ўзор кліент даць не можа (напрыклад, жанчына не паведамляе мужу, што вырашыла ўдакладніць, хто ўсё ж такі бацька яе дзіцяці, ці мужчына не хоча расказваць жонцы, што не зусім давярае ёй). Тады ДНК-узорамі могуць выступаць станок для галення, недакуркі, састрыжаныя пазногці, вушная сера, сталовыя прыборы або, напрыклад, трубачка ад соку, які піў малы.

— У прынцыпе можна даследаваць любы матэрыял, які змяшчае клеткі. Але калі казаць аб нестандартных узорах, валасы — першае, што прапануюць кліенты, але гэта, напэўна, самы няўдалы варыянт. Па-першае, для ДНК-даследавання неабходны валасы з цыбулінай, і, па-другое, іх павінна быць сапраўды вялікая колькасць, інакш лабараторыя выдасць заключэнне «недастаткова генетычнага матэрыялу».

Тры валасінкі, знятыя з расчоскі, — гэта, хутчэй, стэрэатып з серыялаў. Таксама складана вылучыць ДНК, калі ў якасці ўзору кліенты прапануюць зубную шчотку або жавальную гумку.



### Бацькі і дзеці

Для ДНК-тэста на бацькоўства неабходныя генетычныя ўзоры мужчыны і дзіцяці. Узоры маці для даследавання неабавязковыя.

— Калі ўзоры бяруцца ў абаіх бацькоў — значыць, пара ў прынцыпе не ўпэўненая, што гэта іх дзіця.

Але распаўсюджаныя «страшылкі» аб тым, што дзіця могуць «пераблытаць у радзільным доме», ні разу не пацвердзіліся — такіх выпадкаў у практыцы генетыкаў за сем гадоў работы цэнтра не было.

— Прысутнасць маці для правядзення тэста на бацькоўства неабавязковая. Тут трэба весці гаворку ў першую чаргу аб этычным аспекце сітуацыі, — кажа суразмоўніца.

Адна справа, калі мужчына расказаў жонцы, што хоча зрабіць ДНК-тэст на бацькоўства, і тая не змагла або не захацела пры гэтым прысутнічаць. І зусім іншая — калі маці дзіцяці ў прынцыпе не паведамляюць. Або калі яна супраць. Але і ў гэтым выпадку жанчына не можа перашкодзіць правядзенню даследавання. Падаць на мужа ў суд або прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці за тэст на бацькоўства немагчыма — няма такой прававой нормы, кажа спецыяліст. Хоць, зразумела, любой жанчыне непрыемна, калі муж у ёй сумняваецца, і гэта можа стаць прычынай сямейных драм — нават прывесці да разводу. Каб не псаваць адносіны, мужчыны нярэдка трымаюць свой візіт у генетычны цэнтр у сакрэце.

Слова «бацька» генетыкі да атрымання заключэння не выкарыстоўваюць. Практыкуюць больш нейтральную форму «меркаваны бацька».

— Часам кліенты пярэчаць: «Я не меркаваны, я на самай справе бацька», але мы прытрымліваемся гэтай нейтральнай фармулёўкі.

Бывае і наадварот — мужчына ўжо вырашыў, што дзіця «не яго», і цяпер чакае пацвярджэння сваёй здагадкі. Паводле статыстыкі, прыкладна трэць ДНК-тэстаў на бацькоўства дае адмоўны вынік.

— Калі казаць аб працэнтных суадносінах, то ў 2020 годзе адмоўных тэстаў (заключэнняў «бацькоўства выключана») было 30 % ад агульнай колькасці, у 2021-м — 23 %. У сярэднім так звычайна і бывае — ад 23 да 30 % «меркаваных бацькаў» фактычна не аказваюцца біялагічнымі бацькамі сваіх дзяцей.

Магчыма, на самай справе гэты працэнт крыху вышэйшы, бо многія таты нават не допускаюць думкі, што могуць выхоўваць не сваё дзіця, адзначае спецыяліст. Многія мужчыны кажуць: «Мне ўсё роўна, маё ці не маё гэта дзіця ў плане генетыкі». Дарэчы, не заўсёды жанчыны падманваюць мужчын свядома. Жанчына сама можа не ведаць, хто бацька яе дзіцяці. І гаворка не аб маргіналах. Проста жыццё часам бывае складаным і заблытаным...

— Да нас звяртаюцца не толькі мужчыны. Часам жанчына хоча высветліць, хто з дваіх мужчын, з якімі ў яе былі адносіны, з'яўляецца бацькам яе дзіцяці. І тады яна ўпотай збірае нестандартныя ўзоры і праводзіць тэст.

Наколькі можна давяраць ДНК-тэсту на бацькоўства? Дакладнасць даследавання складае 99,9 %, кажа Лізавета Васілеўская.

— Мы даём гарантыю дакладнасці выніку, таму і выкарыстоўваем па тры ўзоры ад кожнага ўдзельніка. Першы і другі — для даследавання, трэці — для пераправеркі. Зрэшты, калі вынік выклікаў у кліента сумненне, рабіць паўторныя ДНК-тэсты на бацькоўства можна неабмежаваную колькасць разоў. Але, як паказвае практыка, вынік паўторнага даследавання заўсёды супадае з папярэднім.

Складанасць у тым, кажа суразмоўніца, што на такія даследаванні людзі, як правіла, прыходзяць з гатовым рашэннем, якое ўжо склалася ў іх у галаве. І калі вынік тэста не супадае з іх чаканнямі, яны чапляюцца за ідэю, што генетыкі маглі памыліцца.

— Некаторыя кліенты кажуць: «Хацеў зрабіць тэст на бацькоўства ўжо пяць гадоў таму, і ніяк не асмельваўся», — распавядае спецыяліст. — А бывае, мужчыны вырашаюць зрабіць тэст на бацькоўства, калі сыну ці дачцэ ўжо 20-25 гадоў. Як паказвае практыка, калі сумненні з'явіліся, мужчына рана ці позна да нас прыйдзе. Шмат хто кажа, што не хоча ўводзіць маці дзіцяці ў курс справы, таму што «гэта проста мае асцярогі», «не хачу псаваць адносіны», «хацелася б праверыць ціха і ананімна».

Таемнае ніколі не стане відавочным, калі сам кліент не прагаворыцца сваім блізкім. Генетыкі дбайна ставяцца і да ананімнасці кліента, і да прыватнасці даследавання — гэта аснова іх прафесіянальнай этыкі.

— Па законе, заказчык мае права не прадастаўляць вынік тэста маці дзіцяці. Бываюць сітуацыі, калі маці тэлефануе ў наш цэнтр, каб даведацца аб выніку ДНК-даследавання, заказчыкам якога быў яе муж. Але мы не маем права паведамляць гэтыя звесткі нікому, акрамя кліента. На гэты выпадак у дагаворы прапісана кодавае слова, якое заказчык мае права паведамляць сваім родным. І калі маці дзіцяці не можа назваць кодавае слова, яна не атрымае вынік. Тады яна падключае іншых сваякоў, і да нас звяртаецца ўжо яе мама — цешча заказчыка. Хачу падкрэсліць: мы не «хаваем мэтанакіравана» вынік ДНК-тэста на бацькоўства ад маці дзіцяці. Калі муж дасць ёй свой «пароль бяспекі», то мы агучым вынік па тэлефоне і па запыце адправім заключэнне.



— У дагаворы, які мы заключаем з кожным кліентам, ёсць найважнейшы пункт: не гарантуем, што вынікі даследавання будуць адказваць вашым чаканням. Да гэтага трэба быць гатовымі, адважваючыся на ДНК-тэст.

Але часта кліент загадзя вырашыў для сябе, бацька ён ці не бацька. І калі атрымлівае не той вынік, якога чакаў, з'яўляюцца сумненні і ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі.

### «Гэта не тваё дзіця!»

Што падштурхоўвае мужчын зрабіць генетычны тэст на бацькоўства? Бывае, сябры, сваякі ці суседзі сказалі, што «сын (дачка) на цябе зусім не падобны(-ая)». Здараецца, жонка падчас сваркі кінула: «Гэта не тваё дзіця!». Часам, напрыклад, калега зрабіў тэст на бацькоўства, і дзіця аказалася не яго... Ідэя «даведацца праўду» афармляецца не адразу, часам яна спее гадамі.

У Беларусі ДНК-экспертызы праводзіць Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, а таксама два прыватныя цэнтры, якія знаходзяцца ў Мінску. Узоры генетыкам прывозяць і дасылаюць з усёй краіны. Бабулі (часцей з боку татаў) нярэдка выступаюць заказчыкамі ДНК-тэста на бацькоўства — генетыкі заўважылі, што колькасць зваротаў узрастае, калі пачынаюцца канікулы і ўнукаў прывозяць да бабуль. Як правіла, такія звароты ўтрымліваюць нестандартныя ўзоры — свякрові правяраюць бацькоўства сына, не даводзячы да яго (і, зразумела, нявесткі) ведама. Радзей звяртаюцца па ДНК-экспертызу на бацькоўства бабулі з боку мамы.

— Быў цікавы выпадак. Заказчыкам выступала бабуля: яна перадала ўзоры свайго сына і ўнука. Лабараторыя выдала заключэнне: бацькоўства ўстаноўлена на 99,999... працэнта. Дзявятак пасля коскі было столькі, колькі змясцілася на бланку. Гэта значыць, яе сын дакладна з'яўляецца бацькам дзіцяці. Але бабуля не здавалася: «А калі я прынясу ўзоры іншага мужчыны, і ў яго будзе на адну дзявятку пасля коскі больш — можа быць, усё ж такі бацькам з'яўляецца ён?».

Дарэчы, не менш дакладны вынік, чым генетычны тэст на бацькоўства, дае ДНК-тэст на сваяцтва, калі сваякі — блізкія (бабуля і ўнучка, дзядуля і ўнук). Калі гаворка ідзе аб больш далёкім сваяцтве — напрыклад, пра дзядзьку і пляменніцу, ступень сваяцтва складзе каля 70 %.

**«Тры валасінкі, знятыя з расчоскі, — гэта, хутчэй, стэрэатып з серыялаў. Таксама складана вылучыць ДНК, калі ў якасці ўзору кліенты прапануюць зубную шчотку або жавальную гумку».**

### Родная кроў

Далёка не заўсёды ДНК-тэст на бацькоўства сведчыць аб узаемным недаверы або канфліктах у пары, тлумачыць спецыяліст. Нярэдка генетычная экспертыза неабходная ў судзе, часам мужчына хоча прылажыць яе да заяўшчання, калі, напрыклад, у яго ёсць дзеці ад розных шлюбаў. Часам пытанне аб сваяцтве ўзнікае пасля смерці меркаванага бацькі — часцей за ўсё, пры падзеле спадчыны. Калі ДНК-даследаванне на бацькоўства або сваяцтва патрэбнае ў судзе, адзначае суразмоўніца, яго можна зрабіць і ў прыватным цэнтры (заключэнні выкарыстоўваюцца як падстава для падачы іскавай заявы і доказ у судзе), але часам лепш звярнуцца ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. І ўсё ж часцей гэтае пытанне ляжыць у сферы міжасабовых адносін — заказчык хоча даведацца праўду «для сябе», кажа Лізавета Васілеўская.

— Нярэдка мы робім тэст на бацькоўства адразу пасля выпіскі мамы з малым з радзільні. Таксама магчымае ўстанаўленне бацькоўства ў дародавым перыядзе — у гэтым выпадку ДНК плода вылучаецца з крыві маці. Працэдура бяспечная — маме дастаткова здаць кроў з вены.

Дародавы тэст на бацькоўства значна даражэйшы — ён абыдзецца заказчыку ў 2750 рублёў і магчымы толькі з дзявятага тыдня цяжарнасці. Паслуга гэтая не надта запатрабаваная: прасцей і танней дачакацца нараджэння дзіцяці і ўжо тады даведацца, хто яго бацька.

Дзіўна, але ў генетычных цэнтраў бываюць нават пастаянныя кліенты — мужчыны, якія праходзілі ДНК-тэст на бацькоўства не адзін і нават не два разы. Напрыклад, зрабіўшы такое даследаванне ў нованароджанага, тата вырашае заадно «праверыць» і іншых сваіх дзяцей. Або, атрымаўшы адмоўны вынік, мужчына разводзіцца з жонкай, а праз некаторы час зноў уступае ў шлюб. І пасля нараджэння дзіцяці ў новай сям'і зноў збірае генетычныя ўзоры для экспертызы — адзін раз перажыўшы боль і расчараванне, вырашае перасцерагчыся.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ЯК ПАДРЫХТАВАЦЬ ДЗІЦЯ ДА ШКОЛЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Чытайце дзецям кніжкі і, калі малое само не дае ацэнак героям ці іх учынкам, спрабуйце выклікаць яго на дыялог. Магчыма, напачатку давядзецца дапамагаць яму пытаннямі і падказкамі: можаце параўноўваць персанажаў з кімсьці са сваіх знаёмых альбо разам прыдумваць працяг казкі. Сумесным чытаннем вы прывіваеце любоў да кнігі, а значыць, і цікавасць да ўрокаў чытання.

### «КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ» ДЛЯ ЛІТАР

Сёння існуе шмат настольных гульняў, якія дапамагаюць у тым ліку засвоіць чытанне і лік. Але ёсць у «настолак» яшчэ адзін шыкоўны бонус. За любой гульнёй стаяць правілы. Спачатку з імі трэба разабрацца, запомніць, пасля іх прытрымлівацца (а гэта прынцыпы, на якіх пабудавана навучанне ў пачатковай школе).

Карысным будуць загадкі, рэбусы, квэсты. Усё гэта можна знайсці ў разнастайнай літаратуры для дашкольнікаў. Крэатыўным і ўважлівым мамам, якія не ляняюцца займацца са сваімі дзеткамі, такія дапаможнікі падкажуць, чым і як іх заняць. Дарэчы, самастойныя заняткі дома могуць быць не менш эфектыўнымі, чым дарагія заняткі ў школах ранняга развіцця. Многія падрыхтоўчыя курсы могуць працаваць пры той навучальнай установе, куды пойдзе ваша дзіця. Часам у іх вядуць заняткі тыя настаўнікі, да якіх яно пасля патрапіць у першы клас. Гэта выдатная магчымасць дашкольніку пазнаёміцца з педагогам і будучымі аднакласнікамі.



Дзіцячая пляцоўка — абавязковы элемент падрыхтоўкі да школы. Падчас гульні з сябрамі дзіця вучыцца наладжваць кантакты, дамаўляцца, выказваць і адстойваць сваю думку. Не трэба забывацца, што ў першым класе ў навучальны працэс закладзена шмат гульнявых элементаў, і дзіця, якое любіць і ўмее гуляць, будзе там адчуваць сябе камфортна і нават з задавальненнем ісці ў школу. А вось некампанейскім, замкнёным малым больш складана перастроіцца на новае жыццё.

Секцыі і гурткі, якія наведвае малое, — таксама выдатная падрыхтоўка да школы. У спартыўнай камандзе яно вучыцца ўзаемадзейнічаць, у творчай — становіцца больш адкрытым і развівае фантазію, а калі нешта майструе — яго пальчыкі прывучаюцца да чыстапісання. Каб падрыхтаваць руку да пісьма, лепей больш ляпіць, выразаць, маляваць. Давайце дзецям розныя матэрыялы і інструменты. Так, васкавыя крэйды ў выглядзе марской галькі дапамагаюць фарміраваць правільнае зацісканне трыма пальцамі, тэкставылучальнікі — нахіленне, а пэндзлікі — націсканне на інструмент (пакажыце, што, калі маляваць самым кончыкам, — лінія атрымліваецца тонкая, а калі пэндзлік прыціснуць — на паперы будзе ўжо больш шырокі след).

Сёння многія дзеці, якія ідуць у першы клас, ужо ўмеюць чытаць і пісаць. Калі вы не жадаеце адстаць ад «прагрэсіўных» і сядзіце разам са сваімі малымі над прапісамі, пастарайцеся гэты працэс навучання пісьму замаскіраваць зноў жа элементамі гульні. Не так многа дзяцей гатовы шматкроць выводзіць адну і тую ж літару, пакуль яна не стане ідэальнай.Ператварыце радок з прапісанымі літарамі... у «конкурс прыгажосці» — няхай дзіця выбірае самую лепшую.

Прывучайце дзіця да пэўнага раскладу — спачатку будзеце планаваць дзень ці прагулку (што зрабіць, куды пайсці спярша, а чым заняцца пасля). Гэта дазволіць не толькі падрыхтаваць малога да школьнага раскладу, але і прывучыць да размеркавання часу для выканання хатніх заданняў.

Нават сумесная закупка школьных тавараў пойдзе на карысць. Калі малы будзе разам з вамі выбіраць заплечнік, пенал і сшыткі, то хутчэй усвядоміць, што ў яго хутка пачнецца новае жыццё.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

### ШТО ПАВІНЕН УМЕЦЬ ШАСЦІГОДКА?

**1.** Адказваць на «класічныя пытанні», якія могуць задаць у школе: назваць свае імя і прозвішча, а таксама як завуць бацькоў, якія ў іх прафесіі. Ведаць свой хатні адрас і тэлефон. Называць дні тыдня, месяц і час года. Умець расказаць пра прыродныя з'явы, характэрныя, напрыклад, для восені, вясны. Арыентавацца ў сутках. Ідэальна, калі дзіця будзе здольна вызначаць час па гадзінніку.

**2.** Ведаць правілы бяспекі на дарозе, «чытаць» сігналы светлафора, ведаць, у якім месцы можна пераходзіць дарогу. Умець звяртацца па дапамогу, калі згубіўся ці заблытаўся.

**3.** Патрэбны элементарныя навыкі самаабслугоўвання. У дзяцей, у гардэробе якіх раней не было сарочак, у школе можа пачацца сапраўдная барацьба з гузікамі: калі загадзя ў спакойнай абстаноўцы не натрэніравацца іх зашпільваць, яны будуць адрывацца кожны дзень. Педагогі першых класаў звяртаюць увагу і на тое, што, аказваецца, многія дзеці не ўмеюць завязваць шнуркі.

**4.** Элементарныя матэматычныя навыкі сёння павінны быць у кожнага дашкольніка. Ен павінен падлічыць ад аднаго да дзесяці і ў адваротным парадку. Разбірацца з паняццямі «больш», «менш», «раўно», ведаць геаметрычныя фігуры. А магчыма, і рашаць простыя задачы накшталт «было дзве птушкі, адна паляцела».

**5.** Важна ўмець карыстацца атрыманай інфармацыяй. Рабіць высновы, параўноўваць прадметы па параметрах. Аб'ядноўваць у групы, вызначаць, што з'яўляецца лішнім. Знаходзіць, чым прадметы падобныя, а чым адрозніваюцца. Складаць апавяданне па сюжэтных малюнках. Знаходзіць сінонімы і антонімы.

**6.** Умець выконваць простыя даручэнні, дапамагаць, працаваць па прапанаваных прыкладах. Выразаць з паперы, рабіць дробныя дэталі з пластыліну і аб'ядноўваць іх у адну кампазіцыю.

**7.** Наладжваць зносіны. Умець выказваць свае эмоцыі і думкі. Жартаваць. Разумець і пераказваць анекдоты, каламбуры, небыліцы. Разумець сваю адказнасць за пэўныя ўчынкі, спачуваць і дапамагаць іншым.

---

Нататкі шматдзетнага таткі

# ДУМАЙ САМ!



Аднойчы Чэрчыль сказаў, што лягчэй кіраваць краінай, чым выхоўваць чатырох дзяцей. Я, шчыра кажучы, ніколі не цікавіўся, колькі дзяцей было ў самога Чэрчыля, але тут успомніў гэтую яго вядомую фразу і вырашыў высветліць.

Аказалася, што ў яго было пяцёра дзяцей, з якіх адзін сын і чатыры дачкі. Чаму ў сваёй знакамітай цытаце ён сказаў пра чацвярых дзяцей, я таксама магу лёгка растлумачыць, бо па сваім досведзе ведаю, што менавіта з нараджэннем чацвёртага дзіцяці да таты, нарэшце, даходзіць, што выхаванне дзяцей — самая складаная праца на свеце.

Таму кемлівы тата звычайна гатовы на ўсё, нават на кіраванне краінай, абы ўцячы ад сваіх прамых абавязкаў. А пасля чатырох дзяцей колькасць ужо не мае прынцыповага значэння: усё роўна немагчыма адначасова сабраць іх усіх у адным месцы і пералічыць.

А паколькі ў мяне, як у Чэрчыля, адзін сын і чатыры дачкі, то, шчыра кажучы, было б таксама цікава параўнаць на ўласным досведзе, што ўсё ж лягчэй: кіраваць краінай ці выхоўваць шматлікіх дзяцей? Так бы мовіць, высветліць эмпірычным шляхам.

Праўда, у нас тут не Англія, і сітуацыя можа ў корані адрозніваць ад чэрчылеўскай. Цалкам магчыма, у нашым выпадку працэс усё ж выхоўваць дзяцей. Менавіта таму было б удвая цікава параўнаць.

У найбліжэйшы час я, вядома, балатавацца не буду: пакуль, шчыра кажучы, ёсць у жыцці справы больш сур'ёзныя. А вось калі мне ўсё канчаткова надакучыць, узброюся цытатай з Чэрчыля — і ў бой.

P.S. Калі, вядома, да таго часу ў мяне не народзіцца хто-небудзь яшчэ.

* * *

Гуляем удваіх з малодшай дачкой, яна едзе ў калясцы. Пытаю яе:

— Табе падабаецца катацца ў калясцы, Ксюша?

— Так.

— А як ты думаеш, у калясцы звычайна ездзяць маленькія дзеці ці вялікія?

— Маленькія.

— А ты маленькая ці вялікая?

— Вялікая.

— Тады чаму ты едзеш у калясцы?

Секунднае замяшанне, а потым геніяльны адказ:

— Сам думай!

P.S. Паспрабаваў сапраўды падумаць сам, але ў выніку так ні да чагосьці і не прыйшоў. Сапраўды, атрымліваецца нейкі парадокс.

* * *

Прыйшоў у дзіцячую бібліятэку здаваць кнігі. Бібліятэкар, гледзячы ў манітор:

— Прозвішча дзіцяці?

— Холад.

— Імя?

Гэтае пытанне мяне заўсёды ставіла ў тупік. Тым больш што ў дадзеным выпадку я ўяўлення не маю, хто менавіта з маіх дзяцей запісаны ў гэтай бібліятэцы.

Кажу бібліятэкару, дастаючы тэлефон:

— Зараз у жонкі ўдакладню.

Бібліятэкар, паднімаючы на лоб акуляры і гледзячы на мяне ва ўпор:

— Вы што, не ведаеце, як завуць ваша дзіця?

— Я не ведаю, хто з маіх дзяцей у вас запісаны. Можаце прачытаць імёны з прозвішчам Холад?

— Вам усе прачытаць? Ці, можа, вы назавяце сваіх дзяцей?

— У мяне іх пяцёра, вам усіх пералічыць?

Бібліятэкар спачувальна:

— Добра, давайце паспрабуем адсеяць па бацьку. Як вас завуць?

— Павел.

— Так... У базе ёсць трое з такім імем па бацьку: Вера, Паліна і Ксенія. Хто з іх ваша?

— Ва ўсякім разе, у мяне ёсць дзеці з такімі імёнамі.

Бібліятэкар з палёгкай:

— Ужо сёе-тое. Давайце зараз правяраць па кніжках. Даставайце кнігі.

У выніку супастаўлення кніжак, што здаюцца мною, з базай даных бібліятэкі высветлілася, што гэтыя трое дзяцей сапраўды мае. Прынамсі, яны бралі менавіта тыя кніжкі, якія прынёс здаваць я (а я іх прынёс штук дваццаць). А гэта, пагадзіцеся, мала падобна на простае супадзенне.

Пакідаючы бібліятэку, я ўпершыню ў жыцці падумаў, як усё ж добра, што людзі прыдумалі такую выдатную рэч, як імя па бацьку. Інакш я, напэўна б, ніколі адсюль не выйшаў.

* * *

Сын уключыў на вялікім тэлевізары ў зале фільм і паставіў яго на паўзу. Малодшая дачка, праходзячы міма тэлевізара, заўважыла знаёмы значок «паўзы» ў верхнім куце экрана і стала на яго націскаць пальцам.

З цікаўнасцю паназіраў за гэтай спробай дзіцяці лічбавай эры ўключыць фільм на тэлевізары пры дапамозе пальца. Але тэлевізар, не абсталяваны тачскрынам, ніяк на гэтыя намаганні не адрэагаваў. Пасля чаго дачка пакрыўдзілася і страціла да яго ўсякую цікавасць.

А вось калі б паставіць на месца гэтага тэлевізара наш стары, лямпавы, уяўляю, з якім захапленнем дзіця б круціла ў ім ручку, што выдае непараўнальнае храбусценне пры пераключэнні. Што ні кажы, а тэлевізары нашага дзяцінства на дотык рэагавалі значна лепш.

P.S. А калі б ты тыцнуў у яго пальцам, ён бы адрэагаваў самым нечаканым чынам.

* * *

Вера:

— Тата, дапамажы мне знайсці мой часопіс з налепкамі.

І, бачачы, што я ніяк не рэагую:

— Я табе рубель дам...

Паколькі такую прапанову дзеці мне зрабілі ўпершыню ў жыцці, я задумаўся: з аднаго боку, рубель для мяне зараз асаблівай пагоды не зробіць, а шукаць часопіс у дзіцячым бардаку — значыць, гарантавана пазбавіцца значнай часткі нервовых клетак.

Але, з іншага боку, калі не знайсці гэты часопіс, прыйдзецца цягнуцца ў кіёск і купляць новы. Прычым не адзін і не толькі Веры.

Старанна ўзважыўшы ў галаве ўсе магчымыя варыянты, у канчатковым выніку абраў другі: пайшоў з трыма малодшымі дачкамі ў найбліжэйшы «Саюздрук» і купіў кожнай па два часопісы: нават калі адзін страціць, другі дакладна застанецца.

А з Верай мы дамовіліся наступным чынам: калі мне калі-небудзь спатрэбіцца рубель, яе прапанова застанецца ў сіле. Тым больш што страчаны часопіс сам сябе ўсё роўна не знойдзе.

**Павел ХОЛАД.**

---

Конкурс

## Мае вы родненькія!

10 красавіка ў розных краінах святкуецца Дзень братоў і сясцёр

Такое сямейнае свята — добрая нагода патэлефанаваць ці напісаць адно аднаму, павіншаваць ці проста спытаць, як справы. Часопіс «Алеся» прапануе вам далучыцца да гэтай цудоўнай традыцыі і аб'яўляе чарговы сямейны конкурс «Мае вы родненькія!»




Дашліце нам у рэдакцыю фотаздымак, на якім вы і вашы брат ці сястра, дадайце невялікі аповед пра сямейныя адносіны і дружбу, пра тое, за што вы ўдзячны адно аднаму, і г. д.

Найлепшы аповед з фотаздымкам выйдзе ў найбліжэйшым нумары часопіса «Алеся». Думаецца, такая публікацыя стане выдатным падарункам вашаму роднаму чалавеку.

***Фотаздымак і аповед дасылайце на адрас: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. «Звязда» (на конкурс часопіса «Алеся») ці па e-mail: alesya@zviazda.by.***

# НЕ ЗАБАРАНЯЙЦЕ САБЕ ФАНТАЗІРАВАЦЬ,

## або Інтым — прапаноўваць!

**Васіля ШАЎЛЯКОВА я знайшла ў топе «10 самых сексуальных беларусаў» па меркаванні беларускіх жанчын. Як высветлілася, урач-псіхатэрапеўт, сексолаг у той рэйтынг, які складалі ў асноўным зоркі беларускай эстрады, трапіў зусім выпадкова. Разам з тым мужчына лічыць сябе дастаткова прыцягальным. Кажа, што шмат увагі ўдзяляе сваёй сексуальнай адукацыі. Падчас размовы пераканалася, што для Васіля не існуе забароненых тэм. Ён не чырванее, калі гаворка заходзіць пра секс. Для яго гэта хутчэй паўсядзённасць. Лічыць, што ў адносінах сексуальная блізкасць знаходзіцца не на першым месцы, але, тым не менш, яе якасць вызначае многае.**



### ПРА ВАЎКА, БАРАБАННУЮ ЎСТАНОЎКУ І МУЖЧЫНСКІЯ СЛЁЗЫ

У тым, што я стаў сексолагам, «вінаваты» мае бацькі. Тата — урач, прафесар, доктар медыцынскіх навук. Мама — медсястра. Таму нядзіўна, што пад маёй падушкай з маленства ляжалі анатамічны атлас і медыцынская энцыклапедыя. Яшчэ калі не ўмеў чытаць, проста разглядаў малюнкі, якіх там было даволі шмат.

Палавое выхаванне павінна пачынацца ўжо з нараджэння. (Многія спецыялісты жартуюць, што нават раней, яшчэ да зачацця.) З самаадукацыі бацькоў, ад якіх пасля дзіця і вучыцца праявам сексуальнасці. Галоўнае дзіцячае пытанне — «адкуль я з'явіўся?» — звычайна нараджаецца каля 4 гадоў. Казаць, што ты яшчэ маленькі для такіх пытанняў, — самая распаўсюджаная памылка бацькоў. Рэакцыя дарослых на праяўленне такой цікавасці павінна быць адэкватнай. Ёсць шмат цудоўных кніг для розных узростаў, якія з задавальненнем чытаюць і бацькі таксама. Бо рэальнасць у тым, што і дзеці, і дарослыя адукоўваюцца дзякуючы гэтым кнігам практычна аднолькава.

У мяне ёсць татуіроўка з выявай ваўка. На вокладцы майго штодзённіка — таксама воўк. Яшчэ ў дзяцінстве я сябе асацыіраваў з гэтым зверам. А потым даведаўся, што ён з'яўляецца маёй татэмнай жывёлай — духоўным абаронцам і заступнікам. Мне здаецца, для сексолага гэта цудоўны татэм. Ваўкі камунікабельныя, і цялесныя кантакты для іх надзвычай важныя. Паміж самцом і самкай кранальныя ўзаемаадносіны: яны вельмі клапоцяцца адно пра аднаго, пра сваё патомства. А яшчэ воўк вельмі сексуальны вобраз, дзе камунікабельнасць суседнічае з адасобленасцю і вялікай каштоўнасцю асабістых межаў.

**«Як бы дзіўна гэта ні гучала, інтым трэба планаваць. Гэта не значыць, што мы павінны займацца любоўю па графіку, але выдзяляць час на рэалізацыю сексуальнасці важна».**

У кожнага мужчыны павінен быць «свой гараж». У мяне гэта музыка, барабанная ўстаноўка. Гэта дазваляе пазбягаць выгарання, атрымліваць дадатковыя драйв, энергетыку, каб потым несці яе ў прафесію, сям'ю. Калі ў мужчыны не застаецца часу на сваё хобі, ён пачынае моцна выгараць. Гэта адна з праблем сучаснага грамадства.

Часам я плачу са сваімі кліентамі, якія прыносяць вельмі цяжкія перажыванні. Навешванне стэрэатыпаў у выхаванні хлопчыкаў: «Цярпі», «Не раві, ты ж мужык» — прыводзіць да сумных наступстваў. Дзіця пастаянна блакіруе свае адчуванні. У выніку прывыкае да ігнаравання патрэб насцяў свайго цела. З-за гэтага потым узнікаюць сур'ёзныя псіхалагічныя праблемы.

Калі ў мяне апускаюцца рукі, я даю сабе магчымасць пагараваць. Хаджу на доўгія прагулкі з навушнікамі, уключаю камп'ютарную гульню. Калі ў мужчыны праблема, ён, як правіла, маўчыць, стараецца застацца сам-насам, каб падумаць. Жанчыны цяжка вытрымліваюць трывогу, таму адразу ж стараюцца яе выгаварыць. Дарэчы, зразумець жанчыну ў яе перажываннях па-сапраўднаму можа толькі жанчына. Бо ў мужчыны асноўнае праяўленне падтрымкі — клопат, канкрэтнае дзеянне, а не суперажыванне.



### ПРА «СРОДАК ПРЫМІРЭННЯ», ДЫНАЗАЎРАЎ І СУЖЭНСКІ ДОЎГ

Наша, беларуская, сексуальнасць дагэтуль поўніцца стэрэатыпамі. Што жанчына можа пацярпець, што ёй менш патрэбна («Цярпі, Зося, так прыйшлося», «сцерпіцца-злюбіцца»). На жаль, свежая ідэя і «сужэнскага доўгу». Хоць няма лепшага спосабу сапсаваць адносіны, чым даць камусьці ў доўг. У нас захоўваецца нізкі ўзровень сексуальнай адукаванасці. У першую чаргу гэта звязана з адсутнасцю палавога выхавання. Нашы бацькі ўсё спасцігалі сваімі сіламі, правільна перадаваць свае веды і вопыт не маглі, ды і ў іх і жадання такога не ўзнікала. Сітуацыя крыху паляпшаецца са зменай пакаленняў, але даволі павольна.

Болевыя адчуванні падчас сексу — гэта «званочак» аб тым, што штосьці ідзе не так, што трэба ўважліва ставіцца да свайго сексуальнага здароўя. У ідэале звярнуцца да спецыяліста. Калі яго доўга ігнараваць, наша псіхіка бярэ руль кіравання ў свае рукі і пачынае сама спрабаваць справіцца з болем. Збольшага гэта заканчваецца не вельмі добра.

Паміж сном і сексам мы часцей выбіраем сон. Бо сон аднаўляе на ўвесь дзень, а секс — на найбліжэйшыя гадзіны (але пры гэтым ён дае матывацыю, паляпшэнне агульнага тонусу, у цэлым здароўя). І праблема не ў сексе, а ў тым, што людзі не ўмеюць размяркоўваць нагрузку. Таму, як бы дзіўна гэта ні гучала, інтым трэба планаваць. Гэта не значыць, што мы павінны займацца любоўю па графіку, але выдзяляць час на рэалізацыю сексуальнасці важна. Гэта можа быць проста рамантычная вячэра, цялесныя практыкі, ну нават можна проста паваляцца — пагладзіць адно аднаго. А то атрымліваецца як у анекдоце. «Як вы бавіце час пасля вяселля?» — «Днём працуем, вечарам ядзім». Так, на жаль, і жыве большасць беларусаў.

Яшчэ адзін міф, растыражаваны фільмамі, што секс — выдатны сродак прымірэння пасля сваркі. Нават з пункту гледжання фізіялогіі і псіхалогіі: калі мужчына знаходзіцца ў негатыўных перажываннях, ён проста не можа ўзбудзіцца. Лепш адразу ж прагаварыць непаразуменні, а пасля ўжо можна падумаць і пра інтым. Назапашаныя ўзаемныя крыўды паступова забіваюць фізічную цягу да партнёра.

Каб дасягнуць аргазму, жанчыне патрэбны камфорт. У першую чаргу псіхалагічны. Жаночая сексуальнасць вельмі моцна залежыць ад псіхаэмацыянальнага стану, у тым ліку ад якасных узаемаадносін з партнёрам. Тады жанчына можа максімальна знізіць самакантроль, аддацца працэсу і не замінаць свайму арганізму атрымліваць задавальненне. Фізічнае ўзбуджэнне для жанчыны далёка не заўсёды на першым плане. Пры якаснай блізкасці і псіхалагічным камфорце нават без аргазму жанчына можа ачуваць такое ж задавальненне і насычэнне, калі б ён здарыўся.

Мужчынская сексуальнасць знаходзіцца ў жаночых руках. Бо мы пастаянна маем патрэбу ў пацвярджэнні сваёй значнасці. І гэта пацвярджэнне можам атрымаць толькі ад жанчын. Мужчынская сексуальнасць, як і мужчынскае мысленне, — прамаліненая, спантанная, імпульсіўная і накіравана на вынік (задавальненне). Разам з тым яна дастаткова ранімая і адчувальная. Ад рэакцыі жанчыны на мужчынскую няўдачу залежыць многае.

Важна размаўляць пра секс, каб не трапіць у няёмкую сітуацыю. Мужчына думае: «Жанчына вось так выгінаецца і ярка рэагуе на мяне, таму што мае ласкі прыносяць ёй задавальненне». Яна ж у гэту хвіліну думае: «Хутчэй бы ўсё гэта завяршылася, бо мне агідна». Нічога не кажа, бо крыўдзіць мужа не хочацца. Так яны і жывуць гадоў 30. Мужчына думае, што ён бог, а жанчына — «Госпадзі, за што мне гэта ўсё?..» У выніку яна пачынае ўсё больш пазбягаць яго, ён пачынае крыўдзіцца, бо не разумее, што адбываецца.

**«Пары часта прыходзяць да нейкага сцэнарыя інтымных адносін, які паўтараецца з разу ў раз. У выніку ўсё ператвараецца ў добра адрэпеціраваную руціну, а то і банальна ў працу».**

Агучваць свае адчуванні падчас блізкасці складана. Але гэтаму трэба вучыцца. Замест таго, каб сказаць «гэта вельмі хутка» скажыце «мне хацелася б павольней». Замест «не рабі так» — «зрабі лепш вось так». Прыбераджыце «ніколі больш так не рабі» і «ну колькі разоў табе казаць» да моманту, калі інтым закончыцца. Калі вам прыемна, скажыце пра гэта некалькі разоў. Ніколі ні пры якіх абставінах не кажыце, што вам падабаецца, калі гэта не так. Лепш прыдумайце стоп-слова (напрыклад, «дыназаўры»), якое будзе азначаць «спыніся зараз жа».

### ПРА НЕСУПАДЗЕННЕ, РУЦІНУ Ў ЛОЖКУ І СІНДРОМ АДКЛАДЗЕНАГА ЖЫЦЦЯ

Калі вы думаеце, што сексолагі — такія гуру сексу, то памыляецеся. Гэта як сцвярджаць, што ўрач-неўролаг заўсёды абсалютна спакойны. Я таксама шмат касячу, у тым ліку і ў сексуальным плане. Проста ў адрозненне ад звычайных людзей магу гэта заўважаць.

Людзі часта не разумеюць: тое, што з імі адбываецца, нармальна ці не? Напрыклад, мужчына з невысокім узроўнем палавой канстытуцыі пачынае хадзіць па ўрачах. І шукаць прычыну, чаму яму сексу не хочацца так, як Васю ці Пецю. Зацыкліваецца на тым, што гэта ненармальна. Пачынаюцца псеўдарасстройствы. У выніку людзі гадамі лечаць тое, чаго няма.

Аднаму трэба займацца сексам па два разы на дзень, іншаму дастаткова разу на месяц. І тое і другое норма. Усё залежыць ад палавой канстытуцыі (моцная, сярэдняя, слабая) канкрэтнага чалавека. Каб гарманічна жыць з партнёрам і не гвалціць свой арганізм, важна ведаць сваю палавую канстытуцыю. У інтэрнэце ёсць тэсты для яе вызначэння. Калі ў пары не супадае палавая канстытуцыя — нічога страшнага. Трэба шукаць кампраміс, дамаўляцца, выкарыстоўваць альтэрнатыўныя спосабы сексуальнай разрадкі.

Пары часта прыходзяць да нейкага сцэнарыя інтымных адносін, які паўтараецца з разу ў раз. У выніку ўсё ператвараецца ў добра адрэпеціраваную руціну, а то і банальна ў працу. З-за гэтага змяншаецца каштоўнасць сексуальнага ўзаемадзеяння, блізкасць адыходзіць на задні план. Каб нават пасля 10 гадоў сумеснага жыцця жаданне не патухла, даследуйце сексуальнасць (сваю і партнёра). Перад намі не той жа самы чалавек 10 гадоў запар. Мы ўвесь час мяняемся, набываем новы досвед, мяняецца рэакцыя нашага цела. Нават адчувальнасць эрагенных зон мяняецца. Цікаўнасць і ўважлівасць да гэтых зменнаў і падтрымлівае сексуальныя адносіны. А таксама інтарэс да ўнутранага свету партнёра, яго развag, ідэй, актыўнае сацыяльнае жыццё як мужа, так і жонкі.

Не зацыкліваецеся на адзіным спосабе дасягнення аргазму, а паспрабуйце адчуць іншае, новае задавальненне. Не забараняйце сабе фантазіраваць. У рамане Джэфры Еўгенідыса «А часам вельмі сумныя», Мадлен прызнаецца, што ёй хацелася б блізкасці пасля «абслугоўвання», і Леанард расчэсвае жонцы валасы, купае ў ванне, выцірае, робіць масаж. Потым, праз нейкі час, Леанард расказвае Мадлен, што ён марыць заняцца любоўю са спячай дзяўчынай, і Мадлен выконвае яго мару. Чым не рамантыка?

Апошнім часам людзі ўсё часцей скардзяцца на няякасны секс. Але часта прычына не ў ім, а ў незадаволенасці сваіх базавых патрэб, што тармозіць сексуальнасць. Наша псіхіка ўспрымае сексуальнае жаданне як патрэбу менш прыярытэтную, чым фізіялагічныя — сон, ежу, бяспеку. Спачатку яны — а потым секс. І вось тут бяда. Асабліва апошнія гады, калі ў свеце адбываецца суцэльныя крызісы і пандэміі...

Не адкладвайце жыццё на потым. Інакш можа развіцца сіндром адкладзенага жыцця. Калі падаецца, што вы не жывяце, а толькі рыхтуецеся да жыцця, ствараеце для яго ўмовы. Спачатку чалавек проста адкладвае дробныя радасці дзеля вялікай мэты. А потым са здзіўленнем заўважае, што развучыўся хацець.

Секс у 20 і 60 гадоў — гэта розныя рэчы. Бліжэй да 60 на першы план выходзіць платанічна-эратычны складнік, калі пяшчота, абдымкі, размовы адыгрываюць большае значэнне, чым сам палавы акт. І гэта нармальна. Гэта не значыць, што секс стаў дрэнным. Ён стаў іншым. Калі мы прымаем гэта і адаптуемся да змен — жывём больш шчасліва.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# «УДЗЯЧНЫ ЗА ЎСЁ І ЎСІМ!»

## ХАДЗІЎ У ХРАМ І ЗАЙМАЎСЯ ТАНЦАМІ

— Леуш Любіч — гэта роднае, славянскае, цудоўнае, прыгожае імя, якое проста перакладаецца «ляўша», «умельца», той, які ўмее спяваць, радавацца... У маім родзе шмат леўшуноў, а, як мы памятаем з казак, ляўша мог і блыху падкаваць, і гэтым усё сказана. Вядома, у мяне ёсць афіцыйнае імя, але яно для пашпарта, храма, энергіі, Божай сілы, для падтрымкі анёла-ахоўніка. Я звычайны, просты хлопец, які нарадзіўся ў горадзе Баранавічы, дзе вучыўся, ствараў, танцаваў і спяваў. Спяваў у каталіцкіх храмах, а танцаваў у народных ансамблях «Лялькі», «Юрачка», «Юнацтва». Усё сваё жыццё іду творчым шляхам. Вядома, я і спортам займаўся — і цяжкай атлетыкай, і фехтаваннем, аднак з пэўных прычын прыйшлося яго пакінуць.

Мая маці Ванда-Марыя Антонаўна вельмі цудоўна спявала, мне голас дастаўся ад яе. Яна не была прафесійнай спявачкай, працавала на фабрыцы мастацкіх вырабаў. А бацька быў дальнабойшчыкам, ён таксама цудоўна спяваў, іграў на баяне. Яго ўсе чакалі з рэйсу, каб запрасіць пабыць сватам на вяселлі ці тамадой. Таму гэты «падвешаны язык» мой крыху ад яго. Скажам так, я рос у нармальнай хрысціянскай творчай сям'і. За маё выхаванне я ім удзячны, бо па сёння не страціў ні душы, ні чалавечнасці.

Пасля перамогі на адным музычным конкурсе з'явілася прапанова накіраваць мяне, шасцігадовага хлопчыка, у музычны інтэрнат у Брэст, але бацькі мяне не аддалі. Мяне больш рыхтавалі да шляху рэлігіі. Я хадзіў у каталіцкі храм, пры гэтым усё роўна танцаваў, абараняў гонар школы, вучыўся ў музычнай школе па класе акардэона. Ды не пашанцавала з педагогам. Галоўнае што ў дзяцінстве? Падтрымаць дзіця, працягнуць руку дапамогі. Мне ж сказалі: ну хочаш — хадзі, не хочаш — не хадзі. Зразумела, мы спявалі ў сямейным коле, я займаўся ў гарадскім Доме культуры ў Баранавічах, пасля мне прапанавалі выступаць у хоры хлопчыкаў, дзе доўгі час быў салістам.



**«Мой галоўны дэвіз па жыцці — любі, што робіш, і рабі, што любіш. Жыві, нясі святло людзям, але пры ўсім гэтым, кім бы ты ні быў, заставайся чалавекам і будзь удзячны за ўсё і ўсім. Я ўдзячны Богу за маю жонку Вольгу, яна цудоўная, я вельмі яе кахаю і шаную. Дзякую лёсу, што маю магчымасць супрацоўнічаць з цудоўнымі творчымі людзьмі, кампазітарамі».**

Але важную ролю ў лёсе адыграў мой цудоўны сусед — кампазітар Фёдар Жыляк. Я заўсёды бегаў за гэтым музыкантам, вельмі захапляўся ім. Любіў наведваць вяселлі, глядзеў, як там спяваюць, іграюць. Было і такое: людзі прыходзілі да нас дадому і прасілі ў маці, каб я паспяваў крыху на іх свяце. Канешне, бацькі дазвалялі, і я ішоў на вяселлі і спяваў там рэпертуар Пугачовай, Лявонцьева ды іншых артыстаў. Іншы раз музыканты нават «мылілі» мне твар, таму што я забіраў іх хлеб *(смяецца)*. Вось такі быў пачатак маёй творчай кар'еры.



І прыйшоў такі момант, калі мы пазнаёміліся з Федзем (Жыляком. — **Аўт.**) — ужо ў іншым узросце, калі мяне не прынялі ў мінскую кансерваторыю: не маглі вызначыцца, хто я: эстраднік альбо акадэміст.

Я рос у сям'і католікаў, з дзяцінства быў у гэтым — пры святарах, епіскапах. Наш хор з Баранавіч неяк паехаў у Чэнстахова, выступалі там перад Папам Рымскім Іаанам Паўлам II. Пасля выступлення я спытаў ва ўрсулянак, ці ёсць побач семінарыя ці манастыр. Яны адвялі мяне да францысканцаў... А праз нейкі перыяд прыйшло запрашэнне ў духоўную семінарыю. Бацькі былі ў шоку, у слязах, я ўсіх шакаваў сваім учынкам... Я вучыўся ў духоўнай семінарыі ў польскім горадзе Лодзь, мне падабалася. Але і там ад творчасці не адыходзіў. З нашымі братамі стварылі музычна-інструментальны ансамбль, перакладалі ўсе псалмы на эстрадны лад. На той момант я думаў, што святарства — мой шлях, стасаваўся з духоўнікамі. Гэта быў цудоўны час, бліскучая адукацыя... Я вучыў на чужой мове — польскай — грэчаскую, латынь, англійскую, італьянскую. Але аднойчы, вяртаючыся ў Баранавічы, сустрэў па дарозе святара Кшыштафа. Ён служыў у Астрахані і запрасіў мяне туды. І здарылася так, што ў Астрахані я... пайшоў на праслухоўванне ў музычны, драматычны тэатры і філармонію. Мяне прынялі салістам-вакалістам 12-га разраду ў музычны тэатр, паступіў у тэатральную студыю, пасля чаго працаваў у драматычным тэатры. Пэўны час была работа адміністратара: прадаваў квіткі зорак расійскай эстрады, каб неяк пракарміць сябе... Мае родныя ад мяне адвярнуліся, бо я абраў не рэлігію, а творчасць. Ну нічога — жыў-радаваўся, пасля, калі я ўвайшоў у асноўную трупу, шмат ставілі прэм'ер у тэатры.

Неяк прыехалі крытыкі з Масквы, з Піцера. Быў такі цудоўны чалавек Генадзь Рыгоравіч Дадамян, ён запрасіў мяне ў Маскву. Першы раз я паехаў і спазніўся. Калі пабываў у Маскве, зразумеў, што, акрамя яе, больш нікуды не хачу. Я з'ехаў з Астрахані, дзе скончыў яшчэ і кулінарныя курсы, якія спатрэбіліся мне ў расійскай сталіцы, — працаваў там у рэстаране «Піраміда», на Чаркізаўскім рынку. Дзе я толькі ні працаваў, каб сябе пракарміць! Паступіў на навучанне ў Расійскі інстытут тэатральнага мастацтва, якое было платным, а яшчэ трэба было здымаць жыллё, вучыцца і працаваць. Навучанне каштавала немалых грошай.

Пачаў займацца менавіта вакалам, запісваў каверы, пайшоў у мюзікл «Метро», пасля ў тэатр Гурвіча «Лятучая мыш», пачаліся здымкі ў кіно, у серыялах і г. д.

## СУСТРЭЧЫ І ВЫПРАБАВАННІ

— Пасля сустрэў цудоўнага чалавека, якога пакахаў. Аказалася, што яна таксама з Баранавіч, завуч Вольга. Проста сябравалі, кантактавалі, паступова зразумелі, што створаны адно для аднаго. І ўжо жывём у шлюбе 22 гады, выхоўваем двух цудоўных дзетак. Жонка працуе ў сферы атамнай энергетыкі фінансістам. Нядаўна ездзілі ў Баранавічы: з жыцця пайшла наша любімая бабуля, Вольгіна мама Ганна Віктараўна, якая замяніла мне родную маці. Яна мяне любіла, за яе я малюся і буду заўсёды памятаць. Дзякуючы аўтару Ларысе Архіпенцы з'явілася кампазіцыя «Далёка за зоркамі», прысвечаная ўсім мамам, абавязкова яе запішу.

Быў вялікі адрэзак часу, калі я адсутнічаў у творчым жыцці. Мне прыйшлося на нейкі час пакінуць усё для таго, каб вылечыць сваіх сынкоў — у іх было генетычнае захворванне. Я зразумеў, што ніхто, акрамя мяне, не выратуе хлопчыкаў. Гэта вельмі цяжка, гэта па восем месяцаў у бальніцы, апарат Ілізарава, інвалідныя каляскі... І мне прыйшлося рабіць для сябе выбар: поспех (а я быў у той час вельмі паспяховым артыстам) ці здароўе дзяцей. Разумеў: ніколі не буду шчаслівым, калі ў мяне дома хворыя дзеці. Быў складаны, цяжкі шлях. Шмат гадоў прайшло — лячэнне, рэабілітацыя, пошук фінансаў, фондаў дапамогі тады не было. З Божай міласцю гэты шлях я пераадолеў.

Вярнуўся ў 2016 годзе з хітом «Магія» (аўтары Ларыса Архіпенка і Яўген Крупнік). З гэтай песняй трапіў у расійскую музычную прэмію «Вікторыя». А задоўга да гэтага, у 2008-м, сама Прымадонна дала мне зялёнае святло. У Алы Барысаўны была радыёстанцыя «Ала». І сябры, каб мяне падтрымаць, адправілі туды маю песню «Акардэон уначы», па якой мяне ўсе ведаюць. І песню ўзялі, а я на той момант быў у Ізраілі ў рэкламным туры. Памятаю, вяртаюся адтуль, а мне званяць з прэтэнзіяй: маўляў, што ж ты не сказаў, што гучыш на радыё «Ала»! Я быў у шоку, у мяне тады такая энергія адкрылася!

## МЫ ЯШЧЭ ПАБАЧЫМСЯ!

— Пазалетась з песняй Фёдара Жыляка «Анёл над горадам» я прадстаўляў Беларусь і Расію ў Пецярбургу на фестывалі «Дабро». З песняй «Пажар» выязджаў на розныя конкурсы. Гэтым разам мы перапісалі «Анёл над горадам», крыху перарабілі разам з Гюнеш Абасавай і Ільёй Паляковым. Была надзея, што запросяць на «Славянскі базар», на жаль, пакуль не атрымалася. Аднак мы яшчэ пабачымся абавязкова. Я хацеў гэтай песняй падтрымаць і нашага Прэзідэнта, сказаць, што дзякуючы яму наша краіна квітнее, што мір, каханне і прыгажосць вышэй за ўсё. Мы ўжо не ведаю колькі гадоў сябруем з Гюнеш Абасавай. Гэтая дзяўчына нарадзілася ў Баранавічах, у нас з ёй агульны настаўнік Фёдар Жыляк, ён нас так выхаваў, і мы па жыцці разам з ёй як творчыя брат і сястра. І я ведаю, колькі гэта дзяўчына зрабіла для Беларусі, лічу яе артысткай № 1 у краіне. Ганаруся, што яна мой сябар. У нас нядаўна адбылася прэм'ера песні «Па-французску», якую можна пачуць на «Рускім радыё» ў Беларусі.

А ўвогуле, пачынаючы з 2002-га, у мяне выйшла больш за 45 твораў, альбом 2008-га «Дару табе», некалькі сінглаў, такія песні, як «Кахаю», «Я адзін, ты адна» аўтараў Любові Варапаевай і Мікалая Архіпава, прыгожы сінгл «Пажар» на музыку Tania Wilson і словы Яўгена Абросімава. Кампазіцыя прынесла шмат перамог на міжнародных і еўрапейскіх конкурсах вакалістаў, выйграў прыз сімпатый гледачоў у міжнародным конкурсе «BUCAC SESLERI — 2017» Гагаузія — Балгарыя, у 2019-м прывёз Гран-пры з Македоніі (Eurofest 2019).

## УДЗЯЧНАСЦЬ

— Мой галоўны дэвіз па жыцці: любі, што робіш, і рабі, што любіш. Жыві, нясі святло людзям, але пры ўсім гэтым, кім бы ты ні быў, заставайся чалавекам і будзь удзячны за ўсё і ўсім.

Я ўдзячны Богу за маю жонку Вольгу, яна цудоўная, я вельмі яе кахаю і шаную. Дзякую лёсу, што маю магчымасць супрацоўнічаць з цудоўнымі творчымі людзьмі, кампазітарамі.

У мяне вельмі шмат ідэй, задум, я перадаю маладым веды акцёрскага і вакальнага майстэрства, у мяне ёсць чым падзяліцца, ведаю, што параіць, я гатовы да любых размоў, стасункаў, сустрэч.

Мне пашанцавала, што Бог мяне пачуў, і, вядома, хочацца, каб Гасподзь і далей падтрымліваў.

Хачу пажадаць усім: беражыце сябе, асабліва ў такі цяжкі час, беражыце гэты маленькі куточак, наш «родны кут», нашу Беларусь. Ведаеце, у песні Гюнеш «Апаліла сэрца» ёсць такія словы — «Маем, ды не беражом, а як страцім — плачам зноў горка». Дык вось я хачу, каб наш цудоўны народ разумеў гэта.

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з архіва спевака.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества СЗАО «ЛадаГарант»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение – Складское помещение, назначение – Склад несгораемых материалов, с инв. 500/D-978819388, общей площадью 39,2 кв. м | 63 720,00 | 6 372,00 | 3 186,00 |
| 2 | Изолированное помещение – Складское помещение, назначение – Склад несгораемых материалов, с инв. 500/D-978819391, общей площадью 37 кв. м | 60 156,00 | 6 015,60 | 3 007,80 |

Лот № 1 и Лот № 2 находятся на цокольном этаже капитального строения, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000005005142, по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 23. Площадь земельного участка – 0,7029 га. Целевое назначение – строительство объектов: «Многоэтажный жилой дом неповышенной комфортности с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр-та Дзержинского – пр-та Жукова – ул. Железнодорожной – ул. Щорса, 1-й этап»

В отношении лотов проводятся первые повторные торги. Стоимость снижена на 10 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 27 (29649) от 10.02.2022, стр. 15

| Лот | Наименование | Местонахождение лотов | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 3 | Комплект полок для документов, 2 шт. | Республика Беларусь, Минский район, д. Обчак, 223010 | 64,87 | 6,49 | 3,24 |
| 4 | Кресло офисное «Менеджер» DF HLN SP-A, 4 шт. | | 269,28 | 26,93 | 13,46 |
| 5 | Стол письменный на мет. опорах, 1 шт.; Стол письменный на мет. опорах, 2 шт.; Стол письменный на мет. опорах, 2 шт.; Стол письменный криволинейный левый, 1 шт.; Стол письменный криволинейный правый, 4 шт.; Стол письменный на мет. опорах, 1 шт. | | 2 356,20 | 235,62 | 117,81 |
| 6 | Стол-приставка (К373), 1 шт.; Стол приставка (К371/Кредо/брнат), 6 шт.; Стол-приставка (К372/Кредо/брнат), 6 шт.; Стол приставка (К373/Кредо/брнат), 4 шт.; Стол-приставка (К374/Кредо/брнат), 1 шт. | | 1 321,92 | 132,19 | 66,10 |
| 7 | Тумба под системный блок (К510/Кредо/брнат), 11 шт.; Тумба приставная, 9 шт. | | 671,98 | 67,20 | 33,60 |
| 8 | Шкаф (Т404/Тема/плт), 1 шт.; Шкаф для одежды (К49С+КДЗ/Кредо/брнат), 2 шт.; Шкаф для документов, 2 шт.; Тумба (Т180/Тема/брнат), 1 шт.; Шкаф для документов (Т100+ТД12/Тема/плт/брнат), 1 шт.; Шкаф для документов (Т404/13/0949+МТ1/13/0950/Тема/плт, 1 шт.; Шкаф для документов, 1 шт.; Шкаф для документов, 3 шт.; Шкаф для документов, 2 шт.; Шкаф для документов, 2 шт. | Республика Беларусь, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16 | 1 641,38 | 164,14 | 82,07 |
| 9 | Копировальный аппарат Mita KM 1635, 1 шт.; Копировальный аппарат Mita KM 1620, 1 шт.; Аппарат факсимильный Panasonic KX-FT984RU-B, 1 шт.; Системный ТА KPDP 38 SER/RUA, 2 шт.; Сканер HP SJ G2710 A4, 1 шт.; Принтер HP LJ 1010 USB с кабелем, 1 шт.; Принтер HP LaserJet P1102, 1 шт.; Терминал Panasonic KX-TS2365RUVV, 2 шт.; Факс Panasonic KX-FP218 RU, 1 шт.; Калькулятор Citizen SDC-435 N, 1 шт. | | 425,95 | 42,60 | 21,30 |
| 10 | ПЭВМ Jet I (13C907) Intel G 2120; Intel G 2120, 4Gb. 500Gb DVD-RW, ATX-450W; ПЭВМ DELTA Delux; ПЭВМ SKI SYSTEMS; ПЭВМ Celeron; Процессор Intel Celeron D341-2.93GHz/Мат. плата Asus P5PL2/Мод. памяти DDRII 512 MB/HDD 80GB SATA/FDD 3.5"/DVD-ROM Sony/Video GF PCX6200TC/ Корпус ATX 300W; Сет. адаптер 2xD-Link 1-port UTP 10/100; Монитор 17" Philips 170S7FS; Клавиатура; Мышь компьютерная; ПЭВМ Celeron; Процессор Intel Celeron D341-2.93GHz/Мат. плата Asus P5ПВ1/Мод. памяти DDR 512 MB/2xHDD 80GB SATA/FDD 3.5"/DVD-ROM Sony/Video GF PCX6200TC/ Корпус ATX 300W; Сет. адаптер D-Link 1-port UTP 10/100; ПЭВМ Prestigio; Cel 1.8/1024/160/DWDRW/FDD; ПЭВМ Prestigio (системный блок); Монитор LCD Philips 170C8FS; Клавиатура Chicony KB; ПЭВМ Prestigio; Cel. 3.2/512/160/DVDRW; Монитор 19" ACER, 1 шт.; Keyboard, 1 шт.; Мышь компьютерная, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio; Pen 4/512MB/80GB/FDD 3.5"/DVD-RW, 1 шт.; Клавиатура, 1 шт.; Мышь компьютерная, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio; Cel2/8/512/DVDCDRW, 1 шт.; Монитор 19" LCD, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio 0799-1200 Celeron Dual-Core 1200/1024/160 DVDRW, 1 шт.; 170C8FS Монитор Phyilips 17" LCD C8 FS, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio 19B3645, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51 INTEL, 1 шт.; ПЭВМ DELTA /ASROCK H61M-VG3/ INTEL; Pentium G2020 29ГГц/DDR3 4GB 1600MHz/ жесткий диск 500Gb SATA /пишущий CD-DVD/RW, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; Процессор 40 Gb/DDR 256Mb /300W/FDD, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; Мышь A4 Tech BW35, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; Клавиатура Chicony KB-9810MB PS/2. 1 шт. | | 516,53 | 51,65 | 25,83 |
| 11 | Холодильник МХ-2823-80, 1 шт. | | 140,76 | 14,08 | 7,04 |

В отношении вышеуказанных лотов проводятся третьи повторные торги. Стоимость снижена на 49 %.
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 237 (29606) от 08.12.2021, стр. 10, № 11 (29633) от 19.01.2022, стр. 10, № 37 (29659) от 24.02.2022, стр. 6

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **30 марта 2022 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | с 10.00 **17 марта 2022 года** до 16.00 **28 марта 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**

Рэзкае павышэнне цэн на прадукты адзначаецца і ў Латвіі. Такога значнага росту тут не назіралася на працягу апошніх дзесяці гадоў. І эксперты пакуль не могуць вызначыць, на якім узроўні ён спыніцца. «Цэны на прадукты харчавання ў Латвіі ў найбліжэйшы час працягнуць павялічвацца», — заявіла ў эфіры «Латвійская радыё» кіраўнік аддзела садзейнічання сельскагаспадарчаму рынку рыжскага Інстытута аграрэсурсаў і эканомікі Інгуна Гулбе. Паводле яе слоў, вырастуць цэны на ўсе харчовыя тавары, бо ніводзін з кампанентаў, якія неабходныя для вытворчасці прадуктаў, не становіцца таннейшым. Гулбе заўважыла, што «жыхары Латвіі актыўна скупляюць соль, грэчку, макароны і рыс».

«Акрамя таго, што аднаўленне гандлю ў найбліжэйшы час застаецца сумнеўным, крызісная сітуацыя можа перашкодзіць пасяўной, што паўплывае на ўраджай наступнага года», — адзначылі ў Еўракамісіі.

### ЗАКУПЛЯЮЦЦА Ў БЕЛАРУСІ

Між тым удвая павялічыўся паток іншаземцаў, якія накіроўваюцца на ўезд у Беларусь праз пункт пропуску «Бенякон». Яны скупляюць таннейшыя беларускія тавары. Такую інфармацыю БелТА агучылі беларускія пагранічнікі. «Літоўскі бок часова прыпыніў ковід-абмежаванні на перасячэнне граніцы, у сувязі з гэтым мы фіксуем двухразовае павелічэнне патоку іншаземцаў, якія накіроўваюцца на ўезд у нашу краіну на законных падставах», — адзначыў афіцыйны прадстаўнік Лідскага пагранічнага атрада Міхаіл Кузняцоў.

Як адзначыў начальнік мытнага паста «Беняконі» Ігар Сцепанчук, за суткі было аформлена больш за сотню легкавых замежных транспартных сродкаў. «Масава вывозяць з Рэспублікі Беларусь аўтамабільнае паліва, прадукты харчавання беларускай вытворчасці, бялізну. Кажуць, што прадукцыя беларускай вытворчасці больш якасная, а прадукты — натуральныя. Акрамя класічнага набору тавараў, вывозілася практычна ўсімі грамадзянамі па 4-5 кілаграмаў солі. Са слоў пасажыраў, гэты тавар, як і многія іншыя, істотна падаражаў у Літве», — адзначыў Ігар Сцепанчук.

У мясцовай краме па дарозе да пункта пропуску працуюць у штатным рэжыме. «Да нас з Літвы ўвесь час прыязджаюць. Купляюць цукар, муку, соль, малочныя прадукты. Але тавар у нас ёсць увесь час», — расказала прадавец Таццяна Гаўрылюк.

Да крамы ў гарадскім пасёлку Воранава перыядычна пад'язджаюць машыны з літоўскімі нумарамі. Адна з пакупніц распавяла, што ў Беларусь прыехала з сынам, таму што месяц таму ў яе памерла маці. І, атрымаўшы патрэбны дазвол у Дзяржпагранкамітэце, яны змаглі прыехаць у Беларусь на магілкі. Таксама вырашылі купіць прадукты і запраўіцца.

«Кожны жыве на свой заробак. І калі цана раней на паліва ў нас у Літве была паўтара еўра, то зараз больш чым два. Як быць? А сыну кожны дзень трэба запраўляцца, ён вучыцца ў Вільнюсе. Розніца ў цане з вашымі цэнамі відавочная», — падзялілася жыхарка Літвы.

Відавочна, што запушчаныя прыбалтыйскімі дзяржавамі санкцыі, як мы і прагназавалі, па «законе бумеранга» да іх вярнуліся. У выніку дзеянняў улад пацярпелі простыя жыхары. Мяркуючы па росце пратэсных настрояў, яны ўжо зрабілі свае высновы.

**Пётр ДУНЬКО.**

## ДАСЛОЎНА

### «УСЁ, ШТО МЫ ВЫРАБЛЯЕМ, НА ВЯЛІКІМ РЫНКУ Ў РАСІІ І КІТАІ БУДЗЕ ЗАПАТРАБАВАНА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць дасягнутых напярэдадні на ўрадавым узроўні беларуска-расійскіх дамоўленасцяў, якія былі прыняты ў развіццё перагавораў кіраўнікоў дзяржаў. Адпаведныя заявы беларускі лідар зрабіў на сустрэчы з кіруючым і аператыўным складам органаў дзяржаўнай бяспекі.

«Тое, за што мы змагаліся з Расіяй заўсёды, адбылося. Нарэшце ў кіраўніцтва Расіі, ды і ва ўсіх расіян сфарміравалася цвёрдае разуменне, што мы павінны быць разам, што Беларусь гэтак жа патрэбна Расіі, як нам патрэбна вялікая Расія», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Мы адтуль атрымлівалі энергарэсурсы, энерганосьбіты, мы іх будзем атрымліваць прыкладна па тых жа, можна сказаць, цэнах, як у Расійскай Федэрацыі, — тое, што мы заўсёды патрабавалі ад Расіі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусь і надалей будзе мець магчымасць працаваць на вялікім расійскім рынку: «І там будзе запатрабавана ўсё, што мы вырабляем: і лёгкая прамысловасць, і нафтаперапрацоўка, нафтахімія. Усё, што мы вырабляем, на гэтым вялікім рынку ў Расіі і Кітаі патрэбна будзе».

Як паведамлялася, 11 сакавіка ў Маскве адбыліся перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна. Сярод тэм, якія абмеркавалі лідары дзвюх краін, былі двухбаковыя адносіны і выстройванне ўзаемадзеяння ў сувязі з жорсткім ціскам Захаду і ЗША і гібрыднай вайной, развязанай супраць Расіі і Беларусі. Канцэптуальна кіраўнікі дзяржаў узгаднілі сумесныя крокі па ўзаемнай падтрымцы ў сувязі з санкцыйным ціскам, у тым ліку па цэнах на энерганосьбіты.

У развіццё дамоўленасцяў прэзідэнтаў 14 сакавіка перагаворы ў Маскве правялі ўрадавыя дэлегацыі Беларусі і Расіі. Па выніках было вырашана, што Расія ўводзіць для беларускіх прадпрыемстваў рэжым суперспрыяння, дасягнута дамоўленасць, што краіны адмовяцца ад долара ў разліках за энергарэсурсы, Расія правядзе рэструктурызацыю крэдытнай запазычанасці Беларусі і сумесна прапрацуе больш аптымальную цану на расійскую нафту. Акрамя таго, Беларусь атрымае фінансаванне ад Расіі ў рамках праграм імпартазамяшчэння.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»
## 19 апреля 2022 в 14.00
## проводит торги по продаже следующих объектов

| № п/п | Наименование объекта продажи | Описание | Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Материалы «комплект заготовок для емкости РВС 100006/у, РВС 1000 б/у» | масса 66,108 тонн | 21 083,03 (Двадцать одна тысяча восемьдесят три рубля 03 копейки) | 2 108,30 (Две тысячи сто восемь рублей 30 копеек) |

**Собственник имущества:** Унитарное предприятие «Запад-Транснефтепродукт», Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Котловца М.П., д. 29, УНН 400084287, тел. для осмотра объектов продажи 80236240551.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся <u>19 апреля 2022 г. в 14.00</u> по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – **<u>18 апреля 2022 до 12.00.</u>**

Регистрация участников торгов **<u>19 апреля 2022 с 13.30 до 14.00</u>** по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, +375 0296927492 (A1).

---

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот № 1 – офис** (административное помещение) общей площадью 115,6 кв. м, инв. номер 200/D-193559, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22–7. **Условие аукциона:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона (кондиционер Mitsubishi FDCV A302HENR (наружный блок) (инвентарный номер 50043395)), на сумму 926,37 бел. руб. с НДС 20 % | **Начальная цена с НДС 20 % – 276 000 бел. руб.** |
| **Лот № 2 – кафе** (помещение общественного питания) общей площадью 114,4 кв. м, инв. номер 200/D-193567, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22–14 | **Начальная цена с НДС 20 % – 272 400,00 бел. руб.** |

**Обременение по лотам:**
**1.** Аренда. Подробная информация у Продавца.
**2.** Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней после проведения аукциона.**
**Срок оплаты: не позднее 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.**
Передача предмета аукциона осуществляется не позднее 3 рабочих дней после полной оплаты покупателем стоимости предмета аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2022 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.03.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **28.03.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## ООО «СпецРеализация»
### объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Агромилк-сервис»

(УНП 190604562, 223070, Минская обл., Минский р-н, с/с Михановичский, АБЗ промбазы ООО «Спецкомплектимпэкс», ком. 9/1 (район дер. Дубовый Лес)),

### находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 01 апреля 2022 года.** Начало – 10.00. Заявки принимаются с 17 марта 2022 года по 30 марта 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Агромилк-сервис» (УНП 190604562)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного унитарного предприятия по оказанию услуг «ЮрЛиния» Павловской В.Н.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Линия по производству сухих смесей | 41 263,20 | 5 % | 10 % |
| 2 | Смеситель ВПМС-100 | 763,20 | 5 % | 10 % |
| 3 | Подъемник грузовой одномачтовый г/п 1т МПГ I-II-K | 4 330,80 | 5 % | 10 % |
| 4 | Компрессор CSM8/5 HP D | 4 207,50 | 5 % | 10 % |

<u>Для участия в торгах необходимо:</u>

1. В срок до 16.00 **30 марта 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 30.03.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

<u>Сведения о предыдущих торгах:</u>
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 16 (29638) за 26.01.2022.

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,
### организатор торгов по продаже имущества ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские» (УНП 500055202), объявляет о проведении 18.04.2022 г. в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:** https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/03/spisok-imushhestva-lptm-1.pdf

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 (29) 866-10-00, Наталья Николаевна.

**Продавец:** ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские».

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **15.04.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **17.03.2022** по 17.00 **15.04.2022** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

<u>Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:</u>
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение двадцати рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение двадцати рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

---

Антикризисный управляющий ИООО «Арвибелагро» (УНП 590700407) – ООО «Капитал Диалог» уведомляет о том, что в связи с утерей печати ИООО «Арвибелагро» просит **считать ее недействительной.**

---

Антикризисный управляющий ООО «Экспресс Ритейл» (УНП 192700860) – Индивидуальный предприниматель Казак Ольга Сергеевна уведомляет о том, что в связи с утерей печати ООО «Экспресс Ритейл» просит **считать ее недействительной.**

УНП 191033686

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ТЕРЕШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### проводит аукцион по продаже в частную собственность гражданам земельных участков, расположенных на территории Терешковичского сельсовета

| Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 321088803101000302, Гомельская область, Гомельский район, д. Новые Терешковичи, участок № 6 площадью 0,1306 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Расположены инженерные коммуникации – сети электроснабжения, водоснабжения. Дорога в гравийном исполнении | 3434,78 | 1557,79 | 343,48 |
| 321088803101000301, Гомельская область, Гомельский район, д. Новые Терешковичи, участок № 7 площадью 0,1383 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Расположены инженерные коммуникации – сети электроснабжения, водоснабжения. Дорога в гравийном исполнении | 3637,29 | 1610,43 | 363,73 |
| 321088803101000300, Гомельская область, Гомельский район, д. Новые Терешковичи, участок № 8 площадью 0,1245 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Расположены инженерные коммуникации – сети электроснабжения, водоснабжения. Дорога в гравийном исполнении | 3274,35 | 1506,24 | 327,44 |

**Аукцион проводится 13 апреля 2022 года в 15.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51А, малый зал заседаний.**

Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Терешковичи, ул. Совхозная, 11а, каб. 3 с даты опубликования по 11.04.2021 с 8.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично, либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок, подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет BY79AKBB36414142000123100000, филиал № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель платежа: Терешковичский сельский исполнительный комитет, УНП 400227059, код платежа **04901**, а также заключает с Терешковичским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

# ДЫПЛАМАТ З ЛОШЫЦЫ

## Усевалад Фальскі іграў у п'есах Купалы і дапамагаў Максіму Багдановічу


Усевалад Фальскі.

**Беларуская гісторыя ледзь не ўся з белых плям і забытых імёнаў...**
**Вось і пра аднаго з заснавальнікаў беларускага тэатра вельмі шмат недакладных звестак. Нарадзіўся ён ці сёмага сакавіка, ці восьмага, ці ў 1886-м, ці ў 1887-м... А дата і месца смерці ўвогуле ў цемры часу. Дзе вучыўся? Таксама невядома. Хіба што пацверджана, нейкі час быў студэнтам Лясного інстытута Пецярбурга. Не ведаюць дакладна даследчыкі нават, як трапіў у тэатральны асяродак.**

І фотаздымкаў практычна няма... У агульным доступе ў сеціве — невялічкі здымак, падобна як на дакумент. З яго на нас шчыра пазірае худзенькі вачасты малады чалавек з вусамі і маленькай барodкай... Гэты маленькі здымак не перадае той незвычайнай энергіі і спрыту, якімі, па водгуках сучаснікаў, ён валодаў і якія скіроўваў на карысць Беларушчыны. Дый, кажуць, былі сумневы ў навукоўцаў, што гэта правільная выява.

### БЫЎ АДНЫМ З ПЕРШЫХ ВЫКАНАЎЦАЎ РОЛІ ЯКІМА САРОКІ

А нарадзіўся Усевалад Фальскі 135 гадоў таму ў Лошыцы. Сёння гэта частка Мінска, а калісьці было прадмесце, што належала напрыканцы XIX стагоддзя пану Любанскаму. Захавалася знакамітая Лошыцкая сядзіба, дзе з'яўляецца прывід пані Ядвігі Любанскай, што патанула ў рэчцы Лошыцы...

Якраз тады, калі здарылася сямейная драма Любанскіх, лошыцкі хлопец Усевалад Фальскі далучыўся да беларускага культурнага адраджэння. Цалкам магчыма, што менавіта падчас вучобы ў Пецярбургу, дзе быў моцны беларускі культурніцкі асяродак, недарэмна і адна з першых пастановак Купалавай «Паўлінкі» адбылася там, сыграная сіламі беларускіх студэнтаў.

Мы ўсе ведаем адну з першых выканаўцаў ролі Паўлінкі — Паўліну Мядзёлку, гарэзную дзёрзкую прыгажуню. А вось каханага Паўлінкі, Якіма Сароку, у знакавай пастаноўцы, што адбылася ў Радашковічах у жніўні 1913-га, сыграў Усевалад Фальскі.

Яму пасля не раз прыйдзецца іграць у гэтай п'есе, але менавіта ягонае выкананне ролі пана Адольфа Быкоўскага называлі бліскучым.

### ЯГО ЎПІКАЛІ ЗА АМАТАРСТВА

Тэатр, мастацтва зацягвае... Фальскі іграе шмат, але нярэдка яго ўпікаюць у тым, што ён непрафесіянал. З Лясным інстытутам — на сцэну?

**Мы ўсе ведаем адну з першых выканаўцаў ролі Паўлінкі — Паўліну Мядзёлку, гарэзную дзёрзкую прыгажуню. А вось каханага Паўлінкі, Якіма Сароку, у знакавай пастаноўцы, што адбылася ў Радашковічах у жніўні 1913-га, сыграў Усевалад Фальскі.**

Язэп Дыла ў сваіх успамінах пра стварэнне Фларыянам Ждановічам у 1913 годзе беларускага артыстычнага гуртка піша, што туды *«апрача самога Ждановіча, увайшлі артысты Акуліч і Валэйка, артысткі Т. Русеччанка і А. Ліпнічанка, якія пакінулі польскую сцэну, і такія здольныя аматары, як У. Фальскі, і іншыя».*

Яшчэ згадка з успамінаў Дылы: *«14 студзеня 1918 года ў клубе Лібава-Роменскай чыгункі ішла «Паўлінка» Я. Купалы. Рэцэнзент газеты адзначыў добрую ігру*


Першае беларускае таварыства драмы і камедыі.

*А. Крыніцы (бацька Паўлінкі), М. Зароснай (Паўлінка), В. Тарасік і М. Шут, якія ігралі старых кабет... Пра Усевалада Фальскага (Якім) пісалася, што яму «прыходзіцца пажадаць больш натуральнасці».*

*«2 красавіка 1918 года трупа таварыства паставіла ў «Беларускай хаце» п'есы «Паўлінка» і «Міхалка». Збор быў бадай што поўны, і артыстаў прымалі цёпла. Рэцэнзент адзначыў добрую ігру Ф. Ждановіча (Якім) і П. Мядзёлкі (Паўлінка). А У. Фальскаму (Адольф) даў параду: «Варта было б больш папрацаваць над роллю».*

Фальскі быў не толькі артыстам, але і хормайстрам. Ва ўспамінах пра «Беларускую хатку» Людвікі Сівіцкай, яна ж паэтка Зоська Верас, ёсць згадка: *«Фальскі прыходзіў са сваім хорам на рэпетыцыі. Невялікі спачатку хор штораз больш разрастаўся. Не вучона, не прафесіянальна, скромна, па-аматарску, але з цэлага сэрца стараючыся, пяялі: «Рабінка-рабіначка», «А ў лесе ў гушчары калыхаліся камары», «Камар лазню тапіў...» і г. д.»*

І вось, здаецца, прыязны водгук — але і тут «не прафесіянальна, скромна, па-аматарску»... Думаецца, Усевалад Фальскі хацеў змяніць такое стаўленне, бо ў 1915 годзе, ужо сталым, скончыў Мінскае музычнае вучылішча Рубінштэйна — вядомага скрыпача, які кіраваў мінскім сімфанічным аркестрам.

Але былі не толькі скептыкі... Тое, што рабіў Фальскі, выклікала шчырае захапленне. Вось як апісвае відавочца выступленне яго хору на Першым усебеларускім з'ездзе: *«В это время позади председательского стола становится белорусский хор. ...Красивые молодые лица, изящные национальные костюмы производят чарующее впечатление. ...Управляет хором т. Фальский, вкладывающий в любимое дело всю свою душу... Поистине родной наш хор очаровал всех присутствующих».*

### АРТЫСТЫ ВЫБРАЛІ ЯГО СТАРШЫНЁЙ БЕЛАРУСКАЙ ТРУПЫ

Можа, як артыст і хормайстар Фальскі і быў у вачах некаторых аматарам, але арганізатарам па агульным меркаванні з'яўляўся бліскучым. Вось як распавядае пра стварэнне Першага беларускага тэатральнага таварыства тая ж Зоська Верас... У гасцях яна пазнаёмілася з Фларыянам Ждановічам, той узяўся праводзіць Людвіку. *«У дарозе ён праінфармаваў мяне аб сваіх планах: хоча астацца ў Менску і арганізаваць беларускую трупу. Ці ж магла быць лепшая навіна! Ён пачаў падрабязна знаёміць мяне са сваімі думкамі, але я яго перапыніла: «У гэтай вельмі цікавай справе я Вам нічога дапамагчы не магу. Прыходзьце ў суботу ў Беларускую хатку на суботнік. У нас ёсць невялікі хор, арганізаваў яго Фальскі. Я пэўная, што сябры хору змогуць быць падставай трупы».*


Беларуская хатка.

*Ждановіч згадзіўся з маёй прапановай, прыйшоў на суботнік, пазнаёміўся з Фальскім, Галубком і іншымі. У хуткім часе праца ў іх закіпела».*

А вось пра тую ж падзею піша Язэп Дыла: *«1 мая 1917 года адбыўся агульны сход усёй артыстычнай трупы з удзелам Ігната Буйніцкага, які прыехаў у Мінск. Яго выбралі кіраўніком таварыства, рэжысёрам жа трупы — Ф. Ждановіча, а гаспадаром-адміністратарам — У. Фальскага...»* А калі трупа рэарганізавалася, *«Старшынёй сваім трупа выбрала У. Фальскага, скарбнікам — А. Крыніцу, сакратаром — Янку Беларуса. Мастацкім кіраўніком і рэжысёрам заставаўся Ф. Ждановіч».*

Фальскі быў чалавекам аўтарытэтным і надзвычай актыўным... У студзені 1919 года нават узначальваў камісарыят замежных спраў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі — фактычна стаў першым беларускім савецкім міністрам замежных спраў. У 1921 годзе быў прызначаны на пасаду намесніка загадчыка аддзела мастацтваў, а яшчэ цягнуў абавязкі вучонага сакратара Акадэмічнага цэнтра Наркамата асветы БССР. Калі давялося жыць у Маскве — спрыяў утварэнню там беларускай тэатральнай студыі. У 1920-м стаў адным з кіраўнікоў тэатральнай секцыі клуба «Беларуская хатка», а літаратурнай секцыяй там, між іншым, кіраваў Якуб Колас.

### АПЕКАВАЎСЯ БЯЗДОМНЫМІ ДЗЕЦЬМІ І МАКСІМАМ БАГДАНОВІЧАМ

Але Фальскі быў не проста палітыкам — шчырым беларусам і чулым чалавекам. У часы Першай сусветнай стаў сябрам Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Працавала ў тым таварыстве і Зоська Верас. Вось што яна ўспамінае: *«Апошнія месяцы ў Менску былі для мяне страшэнна цяжкія: мама мая хварэла, ляжала ў шпіталі, а я чулася такая загубленая, адзінокая. Хоць, праўда, Фальскі і Ксеня Сцяпанаўна ні на хвіліну мяне не пакідалі і мамай маёй апекаваліся».*

Пры Таварыстве адкрылі і дзіцячы прытулак, загадвала якім Зоська Верас. Яна піша, як з Фальскім куплялі для прытулку і самі цягалі ложкі, бялізну, посуд, як Фальскі выстараўся сродкі ў Тацццянінскім камітэце, з якой цяжкасцю ўдавалася даставаць для дзяцей прадукты.

А калі па запрашэнні Беларускай хаткі мусію у Мінск прыехаць Максім Багдановіч, таксама не абышлося без дапамогі Фальскага. Зоська Верас успамінае: *«Сардэчны, скромны і просты, М. Багдановіч адразу заваяваў агульную сімпатыю. Ужо ў канцы вечара здавалася, што ён даўно з намі, што ўсім блізкі і дарагі. Тым больш трывожыла яго бледнасць і бліскучыя ад гарачкі вочы. Кашляў зусім мала. Пасля гарбаты сядзелі нядоўга. Трэба было змучанаму дарогай адпачыць. На кватэру адвялі Багдановіча Смоліч, Фальскі і Галубок».*

Малады паэт з задавальненнем далучыўся да беларускага культурніцкага жыцця: *«вечары, як заўсёды, праводзілі разам з цэлай нашай грамадкай: М. Багдановіч, Фальскі, Смоліч, часта Ядвігін Ш., Галубок, я...»*

Дарэчы, улюбёнай песняй Багдановіча стала песня «Рабіна-рабіначка» з рэпертуару хору Фальскага.

Менавіта Фальскі быў і адным з тых, хто знаходзіў сродкі, каб адправіць хворага Багдановіча на лячэнне ў Крым. Хто ведаў, што гэта падарожжа станецца апошнім...

### ЦЯРПЕЎ НАПАДКІ З-ЗА «НЯСЦІПЛЫХ ПАВОДЗІН» ЖОНКІ І СЯСТРЫ

У навастворанай беларускай савецкай рэспубліцы Фальскі ўзяўся за вялікую працу... У Наркамаце асветы арганізоўваў выступленні тэатральных калектываў, займаўся камплектацыяй музеяў і тэатраў каштоўнымі артэфактамі... А яшчэ абараняў беларускіх творцаў ад беспадстаўных нападак, выбіваў дапамогу для тых, хто ў нястачы. Газета «Звязда» 3 чэрвеня 1921 года апублікавала ягоны адказ на адзін з крытычных артыкулаў: *«Папрокі на адрас работнікаў мастацтваў у тым, што яны ў першую чаргу ставяць пытанне пра харчаванне... няправільныя; што ж тычыцца таго, што работнікам мастацтваў паўсюдна, у тым ліку і мне, даводзіцца галадаць пры паездках — гэта верна».*

Між тым нацыянальна арыентаваныя кадры рабіліся для сістэмы непатрэбнымі і небяспечнымі... «в подотделе «Тео» числится на службе много лиц — актеров чуждых театру» — дакладвае прэзідыум прафсаюза работнікаў мастацтваў Мінгубаддзелу. На старонках той жа «Звязды» крытыкуецца рэпертуар мінскіх тэатраў, які складаецца «ў адрыве ад задач Галоўпалітасветы». Нарэшце дайшло да таго, што надрукавалі пасквіль пра тое, што на спектаклі ў Дзяржтэатры жонка і сястра Фальскага праявілі «дробнабуржуазныя паводзіны», бо адна сядзела ў ложы Саўнаркама, другая — Наркамасветы, хаця мелі «к этим учреждениям... лишь очень отдаленное отношение». Пры гэтым жонка Фальскага была даволі прыкметнай супрацоўніцай Наркамасветы, увосень 1921 года мусіў выйсці падрыхтаваны ёю зборнік беларускіх казак і гульняў. Не выйшаў.

14 чэрвеня 1921 года Фальскі бярэ ўдзел у сходзе беларускіх літаратараў, мастакоў і артыстаў супраць польскага гвалту ў Заходняй Беларусі. Робіць даклад «о насилии польских панов над белорусской культурой и искусством и над их творцом — Белорусским трудовым народом». Па іроніі лёсу праз тры месяцы яго арыштоўваюць як польскага шпіёна.

Далей была Смаленская катаржная турма, высылка, праца за межамі Беларусі... Мара пра вяртанне на радзіму.

Як і калі памёр Фальскі? Ёсць меркаванне, што быў расстраляны ў 1937-м. 6 жніўня 1996 года быў рэабілітаваны Ваенная пракуратурай Рэспублікі Беларусь.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

**Крынічка**

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Ці могуць нарасты на ствале і галінах яблыні быць асаблівасцямі дрэва і не таіць у сабе небяспекі? Могуць, але такія выпадкі адзінкавыя, і найчасцей культура ў небяспецы.**

# Нарасты на ствале яблыні: небяспека ці асаблівасць?

## Імхі і лішайнікі

Іх складана з чымсьці пераблытаць. Характэрныя шэра-зялёныя нарасты з'яўляюцца ў асноўным на старых ці недагледжаных дрэвах і паступова захопліваюць усю



паверхню ствала і шкілетных галін. У выніку пашкоджаныя пасадкі запавольваюць свой рост, дрэнна пладаносяць, а з часам іх галіны засыхаюць і адміраюць.

***Што рабіць?*** Выдаліць мох і лішайнікі з дрэў можна як апрацоўкай пестыцыдамі, так і механічным спосабам. Першы варыянт падыходзіць для позняй восені (пасля лістападу). Прыгатуйце 5 %-ны раствор жалезнага купарвасу (500 г на 10 л вады) і апрацуйце ствалы, шкілетныя галінкі дрэў і прыствольныя кругі. Праз тыдзень лішайнікі і мхі павінны адпасці самі, а глеба будзе абеззаражана.

Другі спосаб можна ўжываць у любую пору года, але лепш усё ж скарыстацца ім у перыяд вегетацыі. Лішайнікі і мох выдаляюць з дрэў ручным спосабам, выкарыстоўваючы цвёрдую шчотку. Пасля заканчэння мерапрыемстваў па ачыстцы раслін трэба пабяліць ствалы дрэў вапнай.

Калі нарасты мхоў і лішайнікаў на яблыні нязначныя, скарыстайцеся народным метадам. Змяшайце 1 кг солі, 2 кг дрэвавага попелу з двума кавалкамі гаспадарчага мыла і развядзіце ўсё гэта ў 10 л гарачай вады. Добра змяшайце, давядзіце да кіпення, астудзіце і нанясіце атрыманы састаў на ствалы, а пры неабходнасці — і на галіны дрэў.

## Грыбы

Нараўне з імхом і лішайнікамі пакінутая без увагі яблыня можа «абзавесціся» і грыбамі, якія таксама могуць выглядаць як нарасты. Напрыклад, белыя нарасты на яблыні часта — нішто іншае, як губы *(рус.* трутовики*)*, якія атакавалі дрэва. Могуць пашкоджваць пладовую культуру і іншыя грыбы.



***Што рабіць?*** Пры выяўленні адзінкавых грыбоў на галінцы ці ствале паспрабуйце дапамагчы дрэву. Для гэтага абрэжце пашкоджаныя галіны каля самага ствала. Калі грыбы выяўлены на ствале, зрэжце іх і зачысціце месца, дзе яны раслі, да здаровай тканкі. Зрэз на дрэве прадэзінфіцыруйце 3 %-ным растворам меднага купарвасу (300 г на 10 л вады).

Калі грыбамі заражана большая частка ствала, пашкоджанае дрэва прыйдзецца спілаваць, пень выкарчаваць і ўсё гэта спаліць.

## Цытаспароз

Акрамя нарастаў, гэтае грыбковае захворванне спрыяе з'яўленню язваў на кары яблынь, якія разрастаюцца і цямнеюць, а таксама высыханню асобных участкаў пашкоджанай кары. Пры цытаспарозе яблыні кара адамрэ разам з асобнымі галінкамі. Хвароба можа пагражаць дрэву на любым годзе яго жыцця.

***Што рабіць?*** Пры выяўленні цытаспарозу вясной, у перыяд набракання ліставых пупышак, апырскайце дрэвы прэпаратам «ХАМ» (40 г на 10 л вады). Ім жа яблыні апрацоўваюць адразу пасля цвіцення ў той жа дазіроўцы. А непасрэдна перад цвіценнем выкарыстоўваюць медны купарвас (50 г на 10 л вады). Даросламу дрэву дастаткова 5 л раствору прэпарату, маладому — 2 л.



Падчас цвіцення яблыні не апрацоўваюць. Як і ў выпадку са здыманнем імхоў і лішайнікаў, апрацаваныя дрэвы пасля варта пабяліць. Гэта робяць у лістападзе ці сакавіку. Выяўленыя ўвесну хворыя галіны трэба абрэзаць і знішчыць, а плямы невялікага памеру зачысціць.

Некаторыя садоўнікі сцвярджаюць, што ў нарастах на дрэве таксама могуць «маскіравацца» і калоніі тлі. Каб праверыць гэтую версію, уважліва агледзьце лісце дрэва. Там вы напэўна выявіце характэрныя ўздуцці.

## Паветраныя карані

Паветраныя карані з вялікай нацяжкай можна аднесці да нарастаў на дрэве. Часцей за ўсё гэты феномен з'яўляецца на прышчэпах праз нейкі час пасля правядзення прышчэпкі. Звычайна ўзнікненне паветраных каранёў ці іх зародкаў звязанае з тым, што асноўнае карэнішча не спраўляецца са сваёй функцыяй і «просіць дапамогі» ў надземнай часткі расліны.

***Што рабіць?*** Калі прыствольны круг замульчыраваны, знiміце мульчу. Калі зямля там сухая, добра паліце дрэва. Калі вільготная і шчыльная — акуратна падрыхлiце глебу. Звычайна гэтых дзеянняў дастаткова, каб паветраныя карані спыніліся ў росце.

Не варта блытаць з нарастамі на дрэвах і капакорань. Ён размяшчаецца на ствале або галінцы і паявлічваецца за кошт камбію, напоўнены дробнымі драўнянымі вузельчыкамі спячых пупышак, якія могуць прачынацца і даваць пачатак новым ствалам расліны. Іншыя варыянты такога роду нарастаў — завіліна, якая мае форму шара, а таксама прыкаранёвы кап. Гэтыя ўтварэнні могуць мець розную прыроду, у тым ліку паталагічную. Але вонкава яны з'яўляюцца патаўшчэннем ствала ці ўласных тканак дрэва, якія прарастаюць вонкі, а не старонні нарасты.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.20 | 19.17 | 11.57 |
| Віцебск — | 7.10 | 19.07 | 11.57 |
| Магілёў — | 7.10 | 19.07 | 11.57 |
| Гомель — | 7.06 | 19.04 | 11.58 |
| Гродна — | 7.35 | 19.33 | 11.58 |
| Брэст — | 7.36 | 19.33 | 11.57 |

## Месяц

*Першая квадра 10 сакавіка. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

***Пр.*** *Ульяны, Васіля, Вячаслава, Герасіма, Данілы, Паўла, Рыгора, Якава.*

***К.*** *Гертруды, Рэгіны, Збігнева, Патрыка, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Фатаграфіі, зробленыя перад застоллем, атрымліваюцца прыгожыя, а пасля яго — цікавыя.**

Хатнія пацукі — вельмі пацешныя і дружалюбныя звяркі, калі яны завяліся не самі.

**Жонка раніцай з вылупленымі вачыма выдала:**

**— Дарагі! Ты не паверыш, што я зараз зрабіла!**

**— І што?**

**— Я падумала! Перш чым прыняць рашэнне!**

Пасля дня нараджэння, на якім у сына былі тры дзяўчыны, Маша, Света і Оля, сын пытаецца ў сваёй маці:

— Ну, мам, угадай, якая з іх мая нявеста?

— Маша, вядома!

— А як ты здагадалася?

— Ды яна, як увайшла, адразу злаваць мяне пачала...



## Даты | Падзеі | Людзі

### 17 САКАВІКА

У краіне

**1597** год — горад Віцебск атрымаў Магдэбургскае правы, у гэтым жа годзе быў зацверджаны герб горада — на блакітным полі выява мужчыны, пад ім — чырвоны меч. У «Даравальной грамаце караля Жыгімонта III віцебскім мяшчанам на Магдэбургскае правы, 1597 г. сакавіка 17» запісана: «Герб надаем месту нашому Витебскому, в блакитном полю образ Спаса Збавителя нашого, и прытом зараз трохи нижей меч голый червоны». Ёсць меркаванне, што менавіта гэты герб з'яўляецца першым афіцыйна зацверджаным гербам горада Віцебска.

**1837** год — нарадзілася (г. Мінск) Каміла Вінцэнтаўна Марцінкевіч (па мужу Асіповіч), беларуская піяністка, кампазітар, педагог. Дачка В. Дуніна-Марцінкевіча. Удзельнічала ў спектаклях тэатра Дуніна-Марцінкевіча, выкладала музыку ў прыватных пансіёнах, арганізоўвала школы для дзяцей бедных (на Маладзечаншчыне, у Мінску). У яе доме збіраліся члены Мінскай арганізацыі Літоўскага правінцыяльнага камітэта. За ўдзел у дэмакратычным руху праследавалася царскімі ўладамі, у 1863 годзе была саслана ў г. Салікамск (цяпер Пермская вобласць), у 1882-м змагла вярнуцца на радзіму.



**1917** год — створаны Мінскі Савет рабочых дэпутатаў і Мінскі Савет салдацкіх дэпутатаў (21 сакавіка аб'яднаны ў Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў). На дзейнасць Савета вялікі ўплыў аказвала група дэлегатаў-бальшавікоў. Дзякуючы бальшавікам Мінскі Савет стаў рэвалюцыйным цэнтрам у Беларусі і на Заходнім фронце. Ён прыняў пастанову аб 8-гадзінным рабочым дні, рэзалюцыю аб нацыяналізацыі асноўных галін прамысловасці, неадкладнай перадачы памешчыцкіх зямель сялянам, распрацаваў Статут салдацкіх камітэтаў.

У свеце

**1497** год — партугальскі мараплавец Васка да Гама дасягнуў берагоў Індыі.

**1861** год — першае ў свеце турыстычнае бюро Томаса Кука ўпершыню адправіла турыстычную групу ў міжнародную паездку (з Лондана ў Парыж).

**1947** год — нарадзіўся Арыстарх Яўгенавіч Ліванаў, савецкі і расійскі артыст тэатра і кіно, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Дзяржаўная граніца», «ТАСС упаўнаважаны заявіць...», «Асабістая справа суддзі Іванова» і многіх іншых.

Так гаварыў...

**ЭЎРЫПІД:**

*«Ад падарунка з подлых рук дабра ты не чакай».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 612.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 сакавіка 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12